Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся.

Б[illegible]ЗЬ

Орган Цэн[illegible]нага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Прыёмныя гадзіны—з 9-й да 3½ гада.

Навінарыстаным рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі перад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі поруч тэксту 1 р. 50 к. Сакрэтныя на 50 проц. дарожэй. Знак тарговаму бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесправоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСаў—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 101 (2590) Серада, 8-га мая 1929 г.

154кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера, 73 Дзярж. Публічн. бібліят. студз. снежань атрым экз.

СЁНЬНЯ АДЧЫНЯЕЦЦА IX УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ.

Д РАБОЧЫХ, СЯЛЯН І ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ—ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ IX УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

Пад лёзунгамі індустрыялізацыі краіны, узьняцьця ўраджайнасьці і пераводу сельскай гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі будзе праходзіць праца зьезду.

АД КІРАЎНІЦТВАМ КАМПАРТЫІ IX УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ ПА-ЛЕНІНСКУ ВЫРАШЫЦЬ УСЕ ЗАДАЧЫ ДАЛЕЙШАГА БУДАЎНІЦТВА БССР

Задачы IX Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Усебеларускі Зьезд Саветаў—[illegible]а арганізаваная воля і розум [illegible]цоўных Беларусі. На Ўсебеларускім Зьезьдзе Саветаў адбываецца непасрэдны арганізаваны [illegible]ел працоўных Беларусі ў вызначэньні ўсіх важнейшых кіруючых пытаньняў дзяржаўнага жыцьця і сацыялістычнага будаўніцтва [illegible]ецкай Беларусі. Рабочыя, работніцы, сяляне, сялянкі і ўсе працоўныя робяць на Ўсебеларускім зьезьдзе Саветаў праверку працы [illegible] сацыялістычным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве Беларусі за мінулы час, вызначаюць у [illegible]аведнасьці з агульнымі задачамі Савецкага Саюзу далейшыя задачы Савецкай Беларусі і арганізуюць органы ўлады, якім даруецца кіраваньне працай і жыцьцём Савецкай Беларусі да наступнага Зьезду Саветаў.

Такое значэньне Ўсебеларускага зьезду прымушае нас з асаблівай важлівасьцю адносіцца да працы зьезду і дапамагаць таму, каб зьезд правільна вызначыў і выразіў задачы нашага далейшага [illegible]цьця і будаўніцтва.

IX Ўсебеларускі Зьезд Саветаў зьбіраецца непасрэдна пасьля XVI канфэрэнцыі Ўсесаюзнай Камуністычнай партыі, якая [illegible]адозьве да ўсіх рабочых і працоўнага сялянства Савецкага Саюзу вызначыла тыя задачы, што пастаўлены гісторыяй перад працоўнымі Савецкага Саюзу. IX Усебеларускі Зьезд Саветаў павінен паставіць наступныя, вызначаныя ў адозьве 16-ай партканфэрэнцыі, задачы ў цэнтры сваёй увагі і працы, як важнейшыя задачы для працоўных Беларусі.

Што трэба зрабіць Савецкай Беларусі, як частцы Савецкага Саюзу, каб за магчыма кароткі гістарычны час Савецкі Саюз дагнаў і перагнаў у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны;

што трэба зрабіць, каб забясьпечыць хуткі рост індустрыі і разам з гэтым уздым сельскай гаспадаркі, забясьпечыўшы разгортваньне буйных абагуленых гаспадарак у вёсцы (савгасы, калгасы) на падставе высокай машыннай тэхнікі;

што трэба зрабіць, каб разгарнуць шырокі рух мас за культуру, зьнішчыць розную збыткоўнасьць, марнатраўства, безгаспадарчасьць, валакіту, бюракратызм;

што трэба зрабіць, каб павесьці далейшы наступ на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, каб іх перамагчы;

што трэба зрабіць для далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

У парадку дня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў пастаўлена пытаньне аб пяцігадовым пляне разьвіцьця гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі. Гэты плян складае частку агульнасаюзнага пяцігадовага пляну і зьяўляецца практычным плянам таго, што трэба зрабіць Савецкай Беларусі, каб вырашыць найбольш пасьпяхова вышэйвызначаныя задачы. Такім парадкам увага IX Ўсебеларускага Зьезду Саветаў павінна быць накіравана на тое, каб дасканала распрацаваць пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі.

Гэты плян будзе абавязковым для выкананьня ўсім саветам і працоўным Беларусі. Гэты плян будзе служыць кіраўніком у нашай штодзённай працы. Гэты плян мы будзем выконваць, абапіраючыся на саюз рабочых і працоўнага сялянства пад кіраўніцтвам рабочае клясы. IX Ўсебеларускі Зьезд Саветаў павінен яшчэ больш замацаваць саюз рабочае клясы з сялянствам, як неабходнай падставы для вырашэньня чарговых і агульных задач барацьбы за ўтварэньне сацыялістычнай грамадзкасьці.

А. ЧАРВЯКОЎ.

Аб адчыненьні IX Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Адчыненьне IX Усебеларускага Зьезду Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў адбудзецца 8-га МАЯ, А 6-й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ, У ПАМЯШКАНЬНІ ДОМУ КУЛЬТУРЫ.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Да ведама дэлегатаў IX Усебеларускага Зьезду Саветаў.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ КАМІСІЯЙ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СКЛІКАНЬНЯ IX УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ЗРОБЛЕН ЗАГАД УСІМ ЦЭНТРАЛЬНЫМ УСТАНОВАМ БССР АБ УСТАНАЎЛЕНЬНІ НАЛЕЖНАГА ПАРАДКУ ПРЫЁМУ ДЭЛЕГАТАЎ ЗЬЕЗДУ ДЛЯ ДАЧЫ ТЛУМАЧЭНЬНЯЎ ПА СПРАВАХ І ЎСІХ ПЫТАНЬНЯХ, ЯКІЯ ІХ ЦІКАВЯЦЬ.

Арганізацыйная камісія.

ПРЫВІТАНЬНІ УРАДУ БССР.

МЫ, СПЭЦЫЯЛІСТЫ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІ, САБРАЎШЫСЯ НА ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД У ЛІКУ 300 ЧАЛАВЕК ЗАПЭЎНЯЕМ ЦВК І СНК, ШТО ПРЫЛОЖЫМ УСЁ СВАЁ СТАРАНЬНЕ І СІЛЫ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ТЫХ МЕРАПРЫЁМСТВАЎ, ЯКІЯ НАМЯЧАЮЦЦМ ЎРАДАМ БЕЛАРУСІ НА БЛІЖЭЙШАЕ ПЯЦІГОДЗЬДЗЕ ПА ЎЗДЫМУ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАБУДОВЕ НАОГУЛ УСЯЕ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАДСТАВАХ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦВК І СНК!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ—КІРАЎНІК РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА.

Прэзыдыум Зьезду.

* * *

ТРЭЦІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ ШЛЕ ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ЦВК БССР.

МЫ ЗАПЭЎНЯЕМ НАШ УРАД, ШТО ПЫТАНЬНІ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД ПРАЦОЎНЫМІ БССР І ЎСЯГО САВЕЦКАГА САЮЗУ Ў ГАЛІНАХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ НАШАЙ КРАІНЫ, РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ЎЗМАЦНЕНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ НАШАГА САВЕЦКАГА САЮЗУ, БУДУЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫРАШАНЫ.

АБЯЦАЕМ НАКІРАВАЦЬ УСЮ ЭНЭРГІЮ ДА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЭТЫХ МЕРАПРЫЁМСТВАЎ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ БЕЛАРУСКІ ЎРАД!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЯГО КІРАЎНІК—КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ!

Прэзыдыум Зьезду.

Сельскую гаспадарку—на сацыялістычныя рэйкі.

(Гутарка з Нам. Наркома Земляробства т. Масюковым).

Сельская гаспадарка БССР паміж 8 і 9 Зьездам Саветаў мела цэлы шэраг посьпехаў у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, і павялічэньне ліку калгасаў у два разы, значныя посьпехі ў галіне сельска-гаспадарчай капэрацыі і асабліва крэдытнай і малочнай. Адначасова мы маем павялічэньне пасеўнага плошчу, павялічэньне валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі, павялічэньне таварнай часткі аграмаджанага сэктару.

Усе гэтыя дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва мы маем у выніку моцнага саюзу рабочае клясы з бедняком і серадняком пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі. 9-ты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў, які зараз зьбіраецца, падагуліць вынікі праробленай працы ў галіне сельскай гаспадаркі; ён адзначыць тыя недахопы, якія мелі месца ў нашай працы, і вызначыць рашучыя шляхі ў далейшым разьвіцьці сельскае гаспадаркі. Гэтымі шляхамі павінны быць: далейшы сацыялістычны наступ на капіталістычныя элемэнты ў вёсцы, рашучае разьвіцьцё сацыялістычных формаў сельскай гаспадаркі—калгасаў, вытворчай каапэрацыі, узмацненьне савгасаў. Посьпехі, якія маюць зараз нашы савгасы, калгасы і вытворчая каапэрацыя, павінны паслужыць лепшым прыкладам у разьвіцьці бядняцкіх і серадняцкіх індывідуальных гаспадарак. Задачы, якія намячаюцца пяцігадовым плянам разьвіцьця сельскай гаспадаркі, у выніку павінны даць рост калгасаў да 750.000 гэкт., каапэраваць бядняцкія і серадняцкія індывідуальныя гаспадаркі на 85 проц., павысіць ураджайнасьць сельскай гаспадаркі ў сярэднім на 45 проц., савгасаў—на 75 проц., калгасаў—на 60 проц., павялічыць колькасьць буйнай рагатай жывёлы на 40 проц. і адначасова дасягнуць паляпшаньня яе якасьці і прадукцыйнасьці, павялічыць таварнасьць сельскай гаспадаркі і ў першую чаргу тэхнічных працаёмкіх культур і жывёлагадоўлі.

У працягу будучага пяцігодзьдзя ў Беларусі павінна быць пабудавана да 600 прадпрыёмстваў для перапрацоўкі прадуктаў сельскай гаспадаркі. Гэта дасьць магчымасьць нашай сельскай гаспадарцы павялічыць яе прадукцыйнасьць і ўзмацніць аграмаджаньне.

У сучасны момант у БССР працуе 130 трактараў. Да канца пяцігодкі ў нас павінна быць 2300 трактараў. Усе гэтыя паказальнікі сьведчаць аб тым, што перад сельскай гаспадаркай стаяць вялізарныя задачы. Ажыцьцяўленьне гэтых задач магчыма пры максымальным выкарыстаньні мясцовых рэсурсаў і магчымасьцяй, у прыватнасьці, пры ўзьняцьці ўраджайнасьці трэба выкарыстаць такія ўгнаеньні, як торф, попел, ванна і лубін. Трэба максымальна мабілізаваць увагу шырокіх бядняцкіх і серадняцкіх сялянскіх мас да пытаньня рэарганізацыі сельскай гаспадаркі па шляху сацыялізму, па шляху агратэхнікі і, наогул, рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на новых культурных сацыялістычных падставах.

І, урэшце, сродкі, якія адпускаюцца дзяржавай, трэба выдаткоўваць пад шырокім грамадзкім кантролем, а таксама максымальна мабілізаваць сродкі самога насельніцтва. Толькі пры ўмове актыўнага ўдзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве, толькі пры ўмове разьвіцьця сацыялістычнага земляробства ў сельскай гаспадарцы, толькі пры ўмове, калі з дробных сялянскіх гаспадарак будуць утвораны масавыя сацыялістычныя формы—калгасы, можна вырашыць задачы, якія стаяць перад сацыялістычнай гаспадаркай у бліжэйшае пяцігодзьдзе.

Ацэньваючы ў гэтых адносінах праробленую працу, намячаючы далейшыя задачы ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, трэба сказаць, што ўсе гэтыя задачы можна будзе выканаць пры шчыльным саюзе рабочай клясы з бедняком і серадняком пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Неабходна сталёвая воля і жалезная вытрыманасьць.

IX ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ БССР.

4-я канфэрэнцыя Беларускага аддзяленьня т-ва былых палітэкатаржан і ссыльна-пасяленцаў вітае Гаспадара Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Мы, былыя палітэкатаржане, загартаваныя ў барацьбе царскай эпохі, абяцаем усімі сіламі падтрымліваць і актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны. Мы добра ўсьведамляем, шчо пяцігодка, гэта жалезная неабходнасьць у гісторыі савецкай краіны, для выкананьня якой неабхадна сталёвая воля і жалезная вытрыманасьць. Дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны—задача ня лёгкая і выканаць яе можна толькі пры поўным адзінстве волі, пры адсутнасьці найменшых хістаньняў у шэрагах пралетарыяту і яго авангарду—кампартыі

Мы абяцаем на першы покліч для абароны савецкай улады ад капіталістычнага наступу—быць заўсёды гатовы.

Пажадаем поўнага посьпеху ў вырашэньні нашых важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве Гаспадар Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі—IX Зьезд Саветаў!

Няхай жыве адзіная Ленінская Кампартыя!

ПРЭЗЫДЫУМ КАНФЭРЭНЦЫІ.

5-цігадовы плян культурнага будаўніцтва.

ДА IX УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

Задача сацыялістычнага будаўніцтва [illegible]соўвае на першы плян разьвіцьцё [illegible]ыялістычна-культурнай справы, неадносьць значнага культурна-палітычнага ўздыму працоўных мас [illegible]азьвіцьцё мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы.

Буйны рост школ сацвыху.

Пяцігадовы плян разьвіцьця народ[illegible]і асьветы прадугледжвае ўвядзеньне [illegible]ка канцу 5-хгодкі ўсеагульнага абавязковага навучаньня дзяцей 8-11 гадоў. У сувязі з гэтым колькасьць камплектаў [illegible] пачатковых чатырохгадовых школ [illegible]ялічыцца з 9550 да 14928. Забясьпечваецца таксама поўнае абслугоўваньне школаў дзяцей нацыянальных [illegible]шасьцяй на іх роднай мове.

Побач з разгортваньнем школьнай [illegible]кі 1 канцэнтру прадугледжваецца і [illegible]львіцьцё школ 2 канцэнтру: ахват [illegible]цей гэтай школай павялічыцца з [illegible] да 25 проц.: у іх будзе навучацца [illegible]000 дзяцей замест 55000 зараз.

За 5 год на новае школьнае будаўніцтва і капітальны рамонт школ 2-га [illegible]цэнтру мяркуецца затраціць каля [illegible]000000 р., што дасьць магчымасьць [illegible]будаваць школьныя будынкі для поўк сямігодак і адрамантаваць усе [illegible]уючыя. Прадугледжвае плян і дось значнае павялічэньне асыгнаваньняў для дапамогі дзецям рабочых і сялянскай беднаты—з 50 да 300 тысяч [illegible]огод будзе выдаткоўвацца на стыпендыі вучням. К канцу 5-хгодкі кольць інтэрнатаў пры сямігодках будзе даведзена да 1-2 на кожны раён.

Непісьменнасьць будзе ліквідавана.

Непісьменнасьць сярод дарослага насьніцтва і падростканў да канца пяцігодкі будзе ліквідавана. У першую [illegible]чаргу маецца на ўвазе ліквідаваць непісьменнасьць сярод дапрызыўнікаў, рабочых, батракоў і жанчын-дэлегатак. [illegible]квідацыя непісьменнасьці сярод нацыянальных меншасьцяй будзе праводзіцца на іх роднай мове. За гэты перыяд сетка лікпунктаў павялічыцца [illegible] 142,6 проц.

Для дапамогі матцы-работніцы ў выхаваньні дзяцей у часе яе работы мяркуецца шырока разгарнуць дашкольнае выхаваньне. Так, колькасьць дзіцячых [illegible]гаў павялічыцца з такім разьлікам, [illegible] ахапіць імі 75 проц. дзяцей работніц. Для абслугоўваньня ў летні [illegible]с дзяцей сельска-гаспадарчых работніх і сялянскай беднаты колькасьць [illegible]цячых пляцовак павялічыцца з 292 [illegible] 523. Прадугледжвае плян і поўную [illegible]квідацыю дзіцячай бясспрытульнасьці.

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы.

У галіне падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы бярэцца напрамак [illegible] разьвіцьцё пераважна масавай прафэсіянальнай асьветы—нізэйшай і сярэдняй—з адначасовым разгортваньнем вышэйшай асьветы на лініі сельскай гаспадаркі, прамысловасьці і педагагічнай асьветы.

Усяго па індустрыяльна-тэхнічнаму ліку, паводле заявак, на 5-цігодзьдзе трэбна 1732 спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. У БССР будзе падрыхтавана 583 спэцыялісты, а рэшта—у іншых рэспубліках, што задаволіць нашы патрэбы толькі на 77 пр.

Для падрыхтоўкі спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі на хімізацыі краіны пры БДУ ў 1929-30 г. адчыняецца хіміка-тэхнічны факультэт. Спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі патрэбна 1699 чал., а будзе падрыхтавана толькі 89 проц. патрэбы.

Цёпла-тэхнічнае аддзяленьне Віцебскага палітэхнікуму з наступнага навучальнага году рэарганізуецца ў мэханічнае аддзяленьне, а хіміка-тэхнічнае аддзяленьне будзе пераведзена ў Менск, дзе яно рэарганізуецца ў самастойны хімічны тэхнікум. Павялічваецца таксама прыём на архітэктурным аддзяленьні Менскага палітэхнікуму, пашыраецца яго дарожнае аддзяленьне і рабочы вячэрні тэхнікум.

Для ўсёй прамысловасьці, будаўніцтва дарожнай справы і каапэрацыі патрэбна 85.046 чал. новай кваліфікаванай рабочай сілы, для падрыхтоўкі якой пашыраецца сетка індустрыяльна-тэхнічных прафшкол, сетка школ фабзавуча, а таксама будзе значна павялічан лік вучэбна-практычных майстэрняў, прафтэхкурсаў, рабочых вячэрніх тэхнікумаў. Апрача таго, на курсах ЦІП за пяцёхгодзьдзе мяркуецца падрыхтаваць 8000 чалавек і праз індывідуальна-брыгаднае вучнёўства—звыш 7000 чалавек. Наогул, у БССР будзе падрыхтавана кваліфікаванай рабочай сілы 59320 чалавек, ці 67,8 проц. заяўленым патрэбы.

У сувязі з шырокім разгортваньнем прафтэхнічнай асьветы намячаецца і шырокае разьвіцьцё школьнага будаўніцтва: за 5 год мяркуецца затраціць на будаўніцтва па лініі прафтэхнічнай асьветы 10.235.000 руб.

Падрыхтоўка спэцыялістаў сельскай гаспадаркі.

У галіне сельскай гаспадаркі ў 5-цігадовым пляне бярэцца ўстаноўка ня толькі на падрыхтоўку спэцыялістаў, але і на шырокую с.-гасасьвету сялянства.

Паводле пляну трэба будзе падрыхтаваць 2473 спэцыялістаў вышэйшай кваліфікацыі; будзе падрыхтавана 1857 чал.; спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі патрэбна 1818 чалавек, будзе падрыхтавана 70 проц. заяўленай патрэбы.

Для падрыхтоўкі спэцыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі маецца на ўвазе арганізаваць пры с.-гасп. акадэміі падрыхтоўку спэцыялістаў па тарфяной справе, лесатэхналёгіі і буйных калгасах. Будзе пашыран прыём на аграномічны факультэт акадэміі і ў Вэтэрынарны інстытут у Віцебску.

Для падрыхтоўкі с.-гасп. спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі таксама мяркуецца правесьці шэраг мерапрыёмстваў, як у галіне адчыненьня новых аддзяленьняў пры існуючых навучальных установах, так і пашырыць прыём у апошнія. Павялічыцца сетка школ і для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы для сельскай гаспадаркі.

Для падвышэньня с.-гасп. ведаў сялянскага актыву мяркуецца штогод у кожным раёне арганізоўваць 1½ месячныя курсы, праз якія за 5 год будзе прапушчана 20.000 сялян. Побач з гэтым сельскім сямігодкам надаецца с.-гасп. ухіл і адначасова будуць разьвівацца школы сялянскай моладзі.

Недахоп спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы будзе папаўняцца праз абмен з іншымі савецкімі рэспублікамі і больш рацыянальнае скарыстаньне спэцыялістаў.

Яшчэ шэраг мерапрыёмстваў.

Патрэбную колькасьць педагогаў дадуць нашы пэдтэхнікумы і пэдфак БДУ. Для падрыхтоўкі дашкольных працаўнікоў з наступнага навучальнага году будзе адчынен дашкольны тэхнікум, адчыніца таксама і фізкультурны тэхнікум. Да канца пяцігодкі патрэбна 506 дактароў, якіх падрыхтуе мэдфак БДУ.

У бліжэйшыя 4-гады мяркуецца адчыніць шэраг новых навукова-дасьледчых устаноў. Асыгнаваньні на навукова-дасьледчую справу павялічацца з 1.146.000 руб. да 3.170.000 руб., а выдаткі на падрыхтоўку новых кадраў навуковых працаўнікоў павялічацца за 5-цігодзьдзе да 2000000 руб.

У заключэньне неабходна сказаць, што для большага ахвату насельніцтва палітасьветнымі ўстановамі мяркуецца пашырыць сетку іх, а таксама рацыяналізаваць усю палітасьветную справу. К канцу 5-годкі на кожныя 2 сельсаветы будзе 1 хата чытальня, клюбы павялічацца з 172 да 216 і г. д. Значна таксама будзе пашырана кінофікацыя і радыёфікацыя гораду і вёскі. Мяркуецца арганізаваць беларускі опэрны тэатр, новыя нацыянальныя вандроўныя тэатры, музтэхнікум мяркуецца рэарганізаваць у кансэрваторыю.

Нямячаецца і шырокае разгортваньне выдавецкай справы.

Вакол Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Учора прыехала частка дэлегацый Віцебшчыны, Бабруйшчыны і Меншчыны.

* * *

У фойэ Дому Культуры арганізуюцца наступныя выстаўкі: па сельскай гаспадарцы, прамысловасьці, напраўчага дому і выдавецтваў БССР і РСФСР. Кнігі на выстаўках будуць прадавацца на льготных умовах.

АБВЯШЧЭНЬНЕ.

У СЕРАДУ, 8-ГА МАЯ, А 5-Й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ

У ВЯЛІКАЙ ЗАЛІ КЛЮБУ КАРЛА МАРКСА

АДБУДЗЕЦЦА

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ КП(б)Б

9-га УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ

Уваход па дэлегацкіх і партыйных білетах.

ПЯТЫ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ.

16 мая ў Маскве адчыняецца V Ўсесаюзны Зьезд Саветаў. Абраньнікі працоўных усяго нашага вялікага Саюзу абмяняюцца вопытам праробленай працы, выслухаюць справаздачу саюзнага ўраду і намецяць шляхі далейшага палітычнага, эканамічнага і культурнага разьвіцьця краіны. Уся тая вялічэзная праца, якая вядзецца ў цэнтры Саюзу і ў самых глухіх яго куткох, знойдзе на гэтым зьезьдзе сваё асьвятленьне.

Досыць параўнаць паміж сабой парадак дню V зьезду з пастановамі, ухваленымі на IV зьезьдзе, каб пераканацца, што краіна плянава рухаецца па намечаным апошнім зьездам саветаў шляху, перамагаючы ўсе перашкоды, якія затрымліваюць рост нашай сацыялістычнай гаспадаркі. Працоўныя СССР добра ведаюць, якія гэта перашкоды: гэта, папершае, культурная адсталасьць, якая засталася нам у спадчыну ад царскага пэрыяду; падругое, варожыя адносіны да нас большасьці імпэрыялістычных дзяржаў, якія спрабуюць затрымаць шпаркі ўздым нашае народнае гаспадаркі; патрэцяе, процідзейнічаньне, якое аказваюць нашай сацыялістычнай творчай працы кулацкія і нэпманскія пласты насельніцтва.

Але творчая энэргія народаў СССР, вызваленых ад уціску капіталізму, зьмятае ўсе гэтыя перашкоды. Ажыцьцяўляецца завет Леніна аб культурнай рэвалюцыі; не ўдаюцца спробы ворагаў уцягнуць нас у вайну і тым адарваць нас ад нашай гаспадарчай працы; цьвёрдай рукой прыдушаецца супраціўленьне нэпманаў і кулакоў і мацнее змычка паміж рабочымі гораду і бядняцка-серадняцкімі пластамі сялянства.

IV зьезд саветаў два гады таму назад ухваліў пастанову аб барацьбе за індустрыялізацыю краіны, за стварэньне ў Саюзе цяжкай індустрыі, якая дала-б нашай лёгкай прамысловасьці і машынабудаўніцтву вугаль, чыгун і сталь; за няўхільнае ажыцьцяўленьне завету Леніна аб электрыфікацыі краіны, якая дасьць нашай прамысловасьці танную энэргію і зробіць электрычны сьвет выгадаю ня толькі гарадоў, але і вёсак.

IV зьезд саветаў падкрэсьліў тую сувязь, якая існуе паміж індустрыялізацыяй краіны і ўздымам сельскае гаспадаркі. Індустрыялізацыя краіны дасьць хлебаробам трактары і с.-г. машыны і забясьпечыць іх мінэральным угнаеньнем і тым самым павялічыць прыбытковасьць нашае сельскае гаспадаркі. Каапэрацыя і калектывізацыя сельскае гаспадаркі дадуць магчымасьць бядняцкім і серадняцкім пластом вёскі поўнасьцю скарыстаць усе тыя пераваг, якія нясе вёсцы разьвіцьцё прамысловасьці.

За два гады краіна зрабіла вялікі крок наперад. Тое, што ў эпоху IV Ўсесаюзнага Зьезду намячалася толькі ў агульных рысах, зараз адлюстроўваецца ў сурова вызначаныя формы. Ад агульнай задачы індустрыялізацыі краіны мы пераходзім да выпрацоўкі пяцігадовага сурова разьлічанага пляну разьвіцьця ўсёй нашай народнай гаспадаркі, пляну, які ахапляе ня толькі прамысловасьць, сельскую гаспадарку і транспарт, але і культурнае разьвіцьцё краіны. Гэты плян, які распрацоўваўся з удзелам усіх навуковых сіл краіны і арганізатараў нашай гаспадаркі, які абмяркоўваўся прафэсіянальнымі арганізацыямі рабочай клясы і адобран XVI партканфэрэнцыяй, саюзны ўрад прадстаўляе на суд абранцаў працоўнага насельніцтва нашага Саюзу.

Калі ў 1927 г. мы маглі толькі канстатаваць, што наша прамысловасьць дасягнула даваеннага ўзроўню, загаіўшы раны, нанесеныя ёй у гады імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнаў, дык пяцігадовы плян ставіць сабе задачу раўняцца ўжо не па даваеннаму ўзроўню, а на перадавыя прамысловыя краіны Захаду. Дагнаць і перагнаць гэтыя краіны, дзвесьці перавагі сацыялістычнага вядзеньня гаспадаркі—вось задача, якую пяцігадовы плян ставіць перад урадам і працоўнымі масамі нашага Саюзу. Бо гэты плян можа быць ажыцьцёўлен толькі пры дружнай працы рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас з органамі савецкай улады.

Мы пашлі наперад і ў галіне задач, якія мы ставім сабе ў адносінах сельскай гаспадаркі. Пяцігадовы план разьлічан на тое, што дастаўка сялянскім гаспадаркам сартавога насьньня, мінэральнага ўгнаеньня, трактараў і с.-г. машын павысіць ураджайнасьць нашых палёў на 35 проц. А прыняты Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам закон аб с.-г. падатку дасьць новы штуршок бядняцкім і серадняцкім пластом да пашырэньня іх гасп. і павялічэньня заворваньня. Дзяржава значна павялічыла сёлета водпуск сродкаў на патрэбы сельскай гаспадаркі: калі ў мінулым годзе на падтрыманьне сельскай гаспадаркі было затрачана па бюджэту 275 млн. руб,, дык сёлета мяркуецца патраціць з дзяржаўных сродкаў 470 млн. руб. Значна пашырана будзе і крэдытаваньне сельскай гаспадаркі. У тойжа час дзяржава будзе садзейнічаць росту савгасаў і калгасаў, у якіх знойдуць прыстасаваньне сваім сілам незаможныя пласты сялянскага насельніцтва.

Тыя мерапрыёмствы, якія намячаюцца ўрадам, дадуць магчымасьць ня толькі зьвяць харчовыя цяжкасьці, ня толькі поўнасьцю забясьпечыць у працягу бліжэйшых двох год патрэбы насельніцтва, але і адначасова пачынаючы в 4-га году пяцігодкі, вывяз хлеба за межы, у абмен на які мы будзем атрымліваць адтуль патрэбныя нам рэчы ўжываньня, сыравіну і складаныя машыны для нашай прамысловасьці.

Савецкі Саюз рашуча рухаецца наперад па шляху ўзьняцьця гаспадарчага і культурнага дабрабыту. Гэты рост, які сьведчыць аб перавагах нашага сацыялістычнага спосабу вядзеньня гаспадаркі, натуральна выклікае злабу з боку капіталістычных краін, не жадаючых прымірыцца з думкаю, што СССР можа дагнаць і перагнаць іх. Вось чаму поруч з клопатамі аб нашай гаспадарцы савецкі ўрад прымае ўсе меры да павялічэньня абароназдольнасьці краіны. Як і на мінулым зьезьдзе, маючаму адбыцца V зьезду будзе прадстаўлен даклад Наркамвазнмора. Працоўныя Саюзу павінны ведаць, як ахоўваюцца межы СССР, і даць адпаведныя ўказаньні вайсковаму камандаваньню.

Працягваючы далей цьвёрдую палітыку міру, мы павінны рыхтаваць адпор маўлівому варожаму нападу, разьвіваць гаспадарку краіны, узьнімаць культурны ўзровень працоўных.

V Ўсесаюзны Зьезд Саветаў павінен вызначыць тыя шляхі, якія вядуць да вырашэньня гэтых важнейшых задач.

Г. У.

На жэнеўскай камісіі „разброеньня“

Нікчэмны малюнак нікчэмнай камэды!

ЖЭНЕВА. На пасяджэньні падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні дэлегацыі асобных дзяржаў імкнуліся да таго, каб утварыць атмасфэру „прымірэньня“ напярэдадні абмеркаваньня пытаньня аб марскіх узброеньнях, на якому ў сапраўднасьці ніводная з дзяржаў не гатова ні да якіх сапраўдных уступак. Спасылаючыся на кіруючы імі „дух прымірэньня“, Гібсон (Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты) і Масільлі (Францыя) падалі праэкт рэзалюцыі па пытаньні аб ваенных матар'ялах. У гэтым праэкце Гібсон і Масільлі, выключаючы як мэтад простага скарачэньня, так і мэтад пабочнага скарачэньня праз ваенныя бюджэты, прапануе ні да чаго не абавязваючую формулу: „абмежаваньне і скарачэньне ваенных матар'ялаў павінна быць зьвязана з наяўнасьцю ваенных выдаткаў, формы якіх будуць абмяркоўвацца на аснове адпаведных артыкулаў праэкту“.

Тав. Літвінаў неадкладна выкрывае сэнс гэтага манэўру. Ён зазначае, што аўтары рэзалюцыі ні па адным з прапанаваных мэтадаў скарачэньня ваенных матар'ялаў не дагаварыліся і прапануюць зусім адмовіцца ад іх абмежаваньня ці скарачэньня. Тав. Літвінаў зазначае, што даны праэкт рэзалюцыі зьяўляецца новым значным кронам назад, бо гэтак званая наяўнасьць ваенных выдаткаў зусім не азначае іх скарачэньня. Урады будуць паведамляць зусім самавольныя лічбы ваенных выдаткаў, не абмежаваныя ніякімі загадамі канфэрэнцыі. Пры гэтым урады могуць нават паведамляць у даны год лічбы, перавышаючыя леташнія.

Тав. Літвінаў сьцьвярджае, што камісія, значыць, зьбіраецца адмовіцца ад прынцыпу абмежаваньня і скарачэньня ваенных матар'ялаў, і заяўляе аб тым, што гэтая рэзалюцыя не адпавядае інтарэсам савецкай дэлегацыі.

Пасьля прамовы т. Літвінава выступае нямецкі дэлегат Бэрнсдорф, які таксама заяўляе аб немагчымасьці згадзіцца з гэтай рэзалюцыяй.

Гібсон спрабуе зьменшыць эфэкт прамовы т. Літвінава і цынічна заяўляе, што амэрыканская дэлегацыя зусім ня зьбіраецца перашкаджаць абмежаваньню і скарачэньню ваенных матар'ялаў. Гібсон дамагаецца неадкладнага канца спрэчак і пайменнага галасаваньня. Прапанова, пададзеная Гібсонам і Масільлі, прымаецца ўсімі галасамі супроць галасоў СССР і Кітаю. Нямецкая дэлегацыя ўстрымалася ад галасаваньня.

Пасьля ўхвалы франка-амэрыканскай прапановы аб ваенных матар'ялах нямецкі дэлегат Бэрнсдорф агаласіў дэклярацыю. Напамінаючы, што камісія сама прызнала сваёй задачай падрыхтоўку значнага скарачэньня ўзброеньняў, дэклярацыя сьцьвярджае, што камісія выпусьціла з-пад увагі гэту задачу ў галіне сухаземных узброеньняў. Нямецкі ўрад адмяжоўваецца ад праграмы, выпрацаванай большасьцю камісіі, і ўскладае на большасьць усю адказнасьць за далейшую падрыхтоўку ўсеагульнай канфэрэнцыі па разброеньню па абраным у сучасны момант шляху. Пасьля агалашэньня дэклярацыі Бэрнсдорфам ставіцца на абмеркаваньне савецкая прапанова аб уключэньні ў канфэрэнцыю артыкулу, абавязваючага захаваць мадэлі сухаземных узброеньняў, існаваўшыя на першага студзеня 1929 г. Абгрунтоўваючы прапанову, т. Літвінаў зазначае, што яна накіравана да прыпыненьня тэрміновай дзейнасьці ў галіне ваенных вынаходзтваў і іх удасканаленьня, Перашкода замене існуючых мадэляў ваеннага матар'ялу нановавынайдзенымі і ўсё больш удасканаленымі, г. зн. больш руйнуючымі, бязумоўна паслужыла б тормазам ажыцьцяўленьня ваенных намераў. Савецкая прапанова не выклікае колькінебудзь сур'ёзнай дыскусіі і адхіляецца ўсімі галасамі—супроць СССР.

Жэнеўскі фарс скончыўся.

ЖЭНЕВА, 6-5. 6-я сэсія падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні 6-га мая скончылася, вярней, абвешчана „адкладзена“—да аднаўленьня па жаданьні старшыні. Марское пытаньне будзе ў далейшым тэмай перамоў паміж урадамі. Ні да чаго не абавязваючыя адказы дэлегатаў марскіх дзяржаў на вядомыя прапановы Гібсона нават не абмяркоўваліся. Літвінаў агаласіў дэклярацыю, у якой вынікі сэсіі характарызуюцца, як крок назад. Адказная прамова Палітыса, які старшынствуе на гэтым пасяджэньні не магла зьменшыць моцнага ўражаньня ад прамовы Літвінава. Самому Палітысу прышлося назваць яе „сапраўдным актам абвінавачаньня“.

Новы праэкт рэпарацыйных выплат.

ПАРЫЖ, 4-5. Агэнцтва Гаваса паведамляе: «старшыня рэпарацыйнае канфэрэнцыі Оўэн Юнг абвясьціў прадстаўніком фінансавых груп, што Шахт згадзіўся пры некаторых агаворках з лічбамі, якія ён яму прапанаваў, і паведаміць заўтра зацікаўленым дэлегацыям нямецкія агаворкі.

Водлуг вестак аўтарытэтных колаў, новы праэкт Юнга прадугледжвае выплату Нямеччыне штогоду 2-х міліярдаў 600 міліёнаў марак на працягу 37-мі гадоў. Ароч таго, Нямеччына атрымлівае долю ў прыбытках банку міжнародных разлікаў. Нямецкія агаворкі ня маюць палітычнага характару. Аўтарытэтныя колы ня ўпэўнены, каб дзяржавы ліхвяры згадзіліся з прапановаю Юнга, бо яго лічбы розьняцца ад лічбаў мэмарандуму дарадчыкаў на 150-200 міліёнаў у меншы бок і значна зьмяншаюць разьмер рэпарацыйных выплат».

Што рабіў латвійскі пасланьнік у Маскве.

РЫГА, 4-V. Водлуг паведамленьняў друку, рыская мытніца, у прысутнасьці члена пэтыцыйнай камісіі сойму Эгліта, затрымала багаж прыехаўшага з СССР ранейшага латвійскага пасланьніка Азольса; багаж складаўся з 80 месц. Агляд багажу яшчэ ня скончан. Мытніца склала акт аб рэчах, якія знаходзіліся ў 5-ці чаданах. У іх выкрыты: вялікі старасьвецкі срэбны крыж, малюнкі, вазы, ювэлірныя вырабы і інш. Агалошана заява Азольса, які лічыць, што латвійская мытніца абышлася з ім вельмі груба. „У той час, сказаў Азольс, як служачыя савецкай мытніцы не палічылі патрэбным аглядаць мае асабістыя рэчы, латвійская мытніца, па незразумелых прычынах, выказала да іх надзвычайную зацікаўленасьць“.

Савецка-эстонскі гандлёвы дагавор.

РЭВЕЛЬ, 4-5. Распачаліся перамовы аб утварэньні савецка-эстонскага гандлёвага дагавору. На пленарным пасяджэньні савецкай і эстонскай дэлегацый пасьля абмену прывітаньнямі была абрана дзелавая камісія, якая неадкладна распачала разгляд эстонскага праэкту дагавору па пунктах.

Замах на літоўскага прэм'ера.

КОЎНЯ, 6-V. Сёньня а 9-й гадзіны вечара каля ўваходу ў тэатр невядомыя асобы ўчынілі замах на літоўскага прэм'ера Вальдэмараса. Адзін з варты Вальдэмараса забіт, другі паранен. Паранены таксама малы пябог Вальдэмараса і дачка праф. Ёдайкіса.

Абвастраньне між Нямеччынаю і Польшчаю.

ВАРШАВА, 6-5. У зьвязку з інцыдэнтам у Апэльні (дзе нямецкія нацыяналісты наладзілі варожую дэманстрацыю польскай трупе, якая прыехала туды на гастролі), у Польшчы наладжана шмат антынямецкіх мітынгаў.

Польшча на шляху Баўгарыі.

ВАРШАВА, 6-5. У вёсцы Каўтэры, Валкавыскага павету паліцыя выкрыла нелегальную літаратуру ў селяніна Флёрыка. Флёрык быў арыштаваны. Ідучы ў паліцыю, ён нібыта хацеў уцячы і быў забіты. У свой час Флёрык адсядзеў 3 гады ў астрозе па абвінавачаньні ў антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Барацьба нямецкага пралетарыяту ня спыняецца

Паліцыя абстрэльвала дамы.

БЭРЛІН, 5-V. 4-га мая ўвечары ў ачэпленых райёнах Нэйкельна і Вэдынга зноў было адноўлена асаднае становішча. З 9 гадзін увечары ва ўсіх дамох быў пагашан сьвет і ўсё вокны павінны былі быць зачынены. Усю ноч працавалі пражэктары, устаноўленыя паліцыяй на дахах і бальконах дамоў. Увесь ачэплены райён быў абкружан драцянымі загародкамі. Позна ўночы на вуліцах адбывалася страшэнная стрэляніна. Паліцэйскія панцырнікі, праяжджаючы па Германштрассэ (вуліца, на якой была пабудавана адна з найбольшых барыкад) і па сумежных з ёй вуліцах, абстрэльвалі дамы з кулямётаў і вінтовак. Пасьля поўначы ў ачэпленым райёне паліцыя зрабіла некалькі стрэлаў.

Водлуг афіцыйнага паведамленьня паліцыі, позна ўночы паліцэйская варта выкрыла сход членаў саюзу чырвоных франтавікоў. Сход быў распушчан. За ноч у ачэпленым райёне было затрымана 100 чалавек.

Асаднае становішча ў ваколіцах Бэрліну.

БЭРЛІН, 6-5. Прадмесьці Бэрліну-Вэдынг і Нэйкельн знаходзіліся ў працягу мая на асадным становішчы і доступ у гэтыя кварталы быў зачынен. Па вуліцах вартавалі нарады паліцэйскіх у сталёвых шлемах і панцырнікі. Невялічкія групкі разганяліся. Зноў было праведзена шмат арыштаў.

У рабочых стралялі разрыўнымі кулямі.

БЭРЛІН, 6-V. Бэрлінская пракуратура наклала забарону на трупы забітых у часе вулічных боек. Дазвол на пахаваньне будзе выдавацца пасьля судова-мэдыцынскага ўскрыцьця. Левыя рабочыя газэты, якія выходзяць па панядзелках, а таксама „Бэрлін Ам Морген“, паведамляюць, што паліцыя страляла разрыўнымі кулямі. Разрыўныя кулі знойдзены ў памяшканьні, дзе адбываўся першамайскі сход вадаправодчыкаў, якое падпала абстрэлу, а таксама на Кейлінэрштрассэ і Вэдынзе. На ўскрыцьці двох забітых выяўлена, што атрыманыя імі пакалечаньні ўчынены разрыўнымі кулямі. Учора на вуліцах Бэрліну прадаваўся першы нумар падпольнай газэты „Ротэ Штурмтаге“. Некаторыя прадаўцы газэты арыштаваны.

Вон рэфармісцкіх штрэйкбрэхераў і раскольнікаў!

БЭРЛІН, 6-5. Адбылася шматлюдная канфэрэнцыя ўрадавых асоб Бэрлін—Брандэнбурскай арганізацыі кампартыі. Канфэрэнцыя выпрацавала наступныя дырэктывы, абавязковыя для ўсіх органаў партыі: БАРАЦЬБА ЗА ВУЛІЦУ ВЯДЗЕЦЦА З ПАДВОЙНАЮ СІЛАЮ; ДЗЕНЬ ПАХАВАНЬНЯ ЗАБІТЫХ У МАЙСКІЯ ДНІ ПАВІНЕН БЫЦЬ АДЗНАЧАН ВЯЛІКАЮ МАНІФЭСТАЦЫЙ ПАД ЛЁЗУНГАМ: „ПРЭЧ ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР! ПРЭЧ КРЫВАВУЮ С.-ДЭМАКРАТЫЮ! ВОН РЭФАРМІСЦКІХ ШТРЭЙКБРЭХЕРАЎ І РАСКОЛЬНІКАЎ! ВЫГАНЯЙЦЕ ІХ З ПАСАДАЎ НА ПРАДПРЫЁМСТВАХ, У ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ САЮЗАХ І МАСАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ! ПРЭЧ УРАД ПАЛІЦЭЙСКАГА ТЭРОРУ, ГОЛАДУ І ВАЙНЫ! ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДЫКТАТУРУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І САВЕЦКІ САЮЗ—БАЦЬКАЎШЧЫНУ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ! НЯХАЙ ЖЫВЕ АДЗІНЫ ФРОНТ ЗМАГАЮЧАГАСЯ ПРАЛЕТАРЫЯТУ!“

Канфэрэнцыя пастанавіла пакласьці ўсе сілы для таго, каб у дзень пахаваньня рабочыя вышлі з прадпрыёмстваў а 2-й гадзіне, а транспартнікі спынілі працу на 15 хвілін. Калі паліцыя зробіць адзіную маніфэстацыю немагчымай, павінны быць у кожным выпадку праведзены сходы і маніфэстацыі ў паасобных райёнах

Забастоўкі пратэсту супроць паліцэйскага тэрору.

БЭРЛІН, 5-V. 4-га мая ў многіх прадпрыёмствах у Бэрліне, асабліва на будоўлях і прадпрыёмствах мэталёвае прамысловасьці, адбываліся забастоўкі пратэсту супроць чыннасьці паліцыі ў Вэдынгу і Нэйкельні. У Гальле амаль на ўсіх пабудовах і на шматлікіх фабрыках і заводах мэталёвае прамысловасьці і іншых прадпрыёмствах была праведзена аднадзённая забастоўка пратэсту супроць паліцэйскага тэрору ў Бэрліне. У Гальле адбылася вялікая дэманстрацыя пратэсту.

* * *

БЭРЛІН, 4-V. Водлуг паведамленьняў, атрыманых з правінцыі, у Гамбургу і Рурскай вобласьці адбываюцца забастоўкі пратэсту супроць крывавых падзей. У Ганаверы, Золінгене і ў Гальле адбыліся дэманстрацыі пратэсту.

Дрэздэнскія рабочыя--на дапамогу бэрлінскім.

БЭРЛІН, 6-5. У Дрэздэне адбыўся вялікі камуністычны сход, скліканы на адчыненьне адкладзенага зьезду кампартыі, які абярнуўся ў маніфэстацыю пратэсту супроць бэрлінскіх падзей. З тымі, хто прыходзіў на сход, паліцыя абыходзілася вельмі груба. Распаўсюджваныя лятучкі канфіскаваліся. Прымежныя вуліцы былі ачышчаны сілаю, прычым былі пушчаны ў ход гумовыя палкі. Праведзена некалькі арыштаў.

Кампартыя Англіі вітае нямецкіх камуністаў.

ЛЁНДАН, 6-5. Камуністычная партыя Англіі паслала нямецкай кампартыі ліст, у якім гаворыцца: „Камуністычная партыя Нямеччыны пакідала рабочаму сьвету новы прыклад рэвалюцыйнай рашучасьці і кіраўніцтва рабочай клясай у справе зьвяржэньня дыктатуры капіталу, ня гледзячы на кулямёты і панцырнікі сацыял-дэмакратычнай паліцыі. Кампартыя Англіі вітае ў асобе нямецкіх камуністаў авангард рабочае клясы Заходняй Эўропы і вернага саюзьніка баявой часткі рабочае клясы Англіі ў яго барацьбе супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны“.

Зачынены 2 камуністычныя газэты.

БЭРЛІН, 3-5. Агэнцтва Вольфа паведамляе: „паліцыя зачыніла газэты „Ротэ Фанэ“ і „Фольксэха“ да 23 мая ўключна. Газэты забаронены на падставе закону аб охове рэспублікі“.

Паход супроць пралетарскіх арганізацый.

Забаранілі чырвоны саюз франтавікоў.

БЭРЛІН, 6-5. Агэнцтва Вольфа паведамляе: „прускі міністр унутраных спраў Грэзэнскі забараніў камуністычны чырвоны саюз франтавікоў ва ўсёй Прусіі“.

* * *

БЭРЛІН, 6-5. Газэта «Бэрлінэр Цэйт Ам Міттаг» зьмяшчае інспіраванае паведамленьне, у якім гаворыцца, што забарона чырвонага саюзу франтавікоў у Прусіі была зроблена са згоды агульна-нямецкага ўраду, і што іншыя нямецкія дзяржавы, бясспрэчна, возьмуць прыклад з Прусіі. У гэтым выпадку акажацца канчаткова забароненым назначаны на „сёмуху“ агляд чырвоных франтавікоў, перанесены ў Саксонію пасьля забароны яго ў Гамбургу. У агульна-нямецкім праўленьні саюзу і ў праўленьні яго Бэрлін-Брандэнбургскага аддзелу, а таксама ва ўсіх нізавых арганізацыях саюзу канфіскаваны інвэнтар і ўсе паперы. На банкаўскія рахункі саюзу таксама накладзена канфіскацыя.

Баварыя таксама распусьціла чырвоны саюз франтавікоў.

БЭРЛІН, 6-5. Агэнцтва Вольфа паведамляе: «Міністэрства ўнутраных спраў Баварыі абвясьціла распушчаным чырвоны саюз франтавікоў, а таксама саюз „Ротэ-юнг-фронт“ з усімі іх пабочнымі арганізацыямі. Маемасьць распушчаных арганізацый канфіскавана“.

Вобыск у доме кампартыі.

БЭРЛІН, 6-V. Сёньня ўдзень значны нарад паліцыі ўчыніў вобыск у доме камуністычнай партыі (дом імя Лібкнэхта). Канфіскаваны друкаваныя матар'ялы і рукапісы.

Вобыскі паліцыі не далі вынікаў.

БЭРЛІН, 6-5. Як паведамляюць, вобыскі, учыненыя паліцыяй у памяшканьнях розных камуністычных арганізацый, не далі ніякіх значных вынікаў. Буржуазныя газэты тлумачаць гэта тым, што камуністы загадзя даведаліся пра намер улады расьпусьціць Чырвоны саюз франтавікоў і ўчыніць вобыскі (хоць гэты намер і захоўваўся ў тайне) або, прынамсі, лічылі магчымымі гэткія мерапрыёмствы.

На старонках польскае прэсы.

Эканамічны крызіс, які перажывае Польшча, надзвычайная заблытанасьць палітычнага становішчы, няўпэўненасьць у заўтрашнім дні і адсутнасьць кэрэнэктыў на будучыню патроху пачынаюць адбівацца ў польскай прэсе. Праўда, гэтыя цяжкасьці прыкрываюцца рознымі сэнсацыямі, накшталт пахаваньня Фоша, якое да гэтага часу ня страціла яшчэ сваёй вострасьці для польскіх газэт, накшталт параднага вясельля дачкі амэрыканскага ўпаўнаважанага Дэвэя, накшталт апісаньня кожнага кроку Пілсудзкага, ледзь не паведамленьняў пра яго апэтыт і стан страўніка, або апісаньня прыгожае жанчыны, якая атрымала першы прыз на конкурсе прыгожасьці.

Усё-ж такі прэсе ледзь удаецца прыкрыць гэтыя цяжкасьці.

Эканамічны крызіс.

Галоўнае для Польшчы пытаньне—гэта, зразумела, эканамічны крызіс. Замаўчаць яго больш ня ўдасца. Зачыненьне шэрагу фабрык і заводаў у Лодзі мімаволі прымушае над гэтым задумацца.

Лодзінская эканамічная часопісь „Правда“, якая на працягу апошніх 2-х гадоў ня спыняла сьпяваць гімн росквіту гаспадаркі, які нібыта запанаваў у выніку майскага перавароту, зараз піша так:

„Мы ўступілі ў пэрыяд надзвычайна вострага гаспадарчага крызісу. Галоўныя рысы яго ўжо выявіліся даволі выразна; зьніжэньне падатковых прыбыткаў, рост ліку апратэставаных вэксалёў, зьніжэньне прадукцыі ў галоўных галінах прамысловасьці, рост ліку беспрацоўных і скарачэньне працоўнага тыдню на некаторых прадпрыёмствах, уцечка чужаземнае валюты—усё гэта вельмі выразныя адзнакі.

У нашым эканамічным ладзе і ў той гаспадарчай палітыцы, якую мы праводзілі да гэтага часу, хаваюцца карэньні самага вострага, больш цяжкага, чымся калі-небудзь, крызісу. Гэтае праўды нельга нам больш забываць“.

Становішча ў Польшчы, як відаць, зрабілася вельмі сур'ёзным, калі часопісь, якая па працягу 2-х гадоў з пенаю навальвалася на кожную самую слабую крытыку існуючых у Польшчы параднаў, загаварыла ня толькі пра крызіс, але і пра тое, што прычына яго знаходзіцца ў сучасным ладзе і палітыцы.

„Кур'ер Варшавскі“ ў артыкуле «З польскага Манчэстэру» таксама спыняецца на крызісе:

„Ужо некалькі месяцаў Лодзь перажывае цяжкі крызіс, які адчуваецца як у прамысловасьці, так і ў гандлі. Прычына крызісу—адсутнасьць попыту нават на рынку ўнутраным, за якім хаваецца паступовае, але няўхільнае пагоршаньне становішча жыхарства, традыцыйны ўжо цяжар падаткаў, адсутнасьць крэдытаў наогул і танных, у асобку. Не апошнюю ролю ў крызісе адыгрывае скарачэньне вывазу за межы. Лодзінская прамысловасьць, прыстасаваная перад вайною, пераважна, да вывазу ў Расею, зараз ніяк ня можа прыстасавацца да новых варункаў.

Згодна інфармацыі прамысловасьць ніколі яшчэ не перажывала такога цяжкага крызісу. Не дапамогуць ёй і чуткі аб надыходзячых савецкіх закупках лодзінскіх тавараў.

Калі ў бліжэйшы час становішча не палепшыцца, дык стан лодзінскае прамысловасьці можа зрабіцца вельмі крытычным».

Палепшыцца, аднак, становішча можа, відаць, толькі па «волі божай», бо ніякіх шляхоў, ніякіх мэтадаў, ніякіх сродкаў, каб зжыць крызіс, газэты ня бачаць.

Адзінаю газэтаю, якая не заўважвае зусім эканамічнага крызісу, зьяўляецца пэнэсэўская газэта «Роботнік». Звальненьне 50-ці тысяч рабочых у Лодзі, нясупыннае пагоршаньне стану рабочых, якое прызнаецца нават буржуазнай прэсай—нічога гэтага ня бачыць «сацыялістычная» газэта. Невялікая напыжаная партыйная рэзалюцыя—вось і ўсё, што газэты знайшлі ў сваім арсэнале, каб адгукнуцца на крызіс у Польшчы.

Ці прыгодны ўрад?

Ці прыгодны ўрад пілсудчыкаў? Ціха, боязна гэтае пытаньне ўсё-ж такі ўзьнікае ў польскай прэсе.

Вельмі цяжкім зьяўляецца становішча, каб устрымацца ад пастаноўкі гэтага пытаньня.

„Газэта Варшавска“ піша:

Пілсудчыкі заяўляюць, што маюць арганізацыйны і дысцыплінуючы талент. Дапусьцім, што гэта так. Але гэтых асаблівасьцяй даволі, каб захапіць уладу ў свае рукі, і мала, каб кіраваць краінаю і трымаць уладу ў сваіх руках. Для гэтага неабходна яшчэ мець розум. Апошні вымагае здольнасьці кіраваць і дамагчыся грамадзкага прызнаньня. Ён вымагае пэўнага погляду і думкі аб палітычным становішчы. Ён вымагае шырокага пляну. Усё гэта гаворыць аб неабходнасьці мець шырокую праграму. Пілсудчыкі-ж ня толькі ня маюць ніякае праграмы, але яшчэ і ганарацца гэтым сваім дэфэктам».

Такая зьнявага, натуральна, выклікала нездаволеньне афіцыёзу пілсудчыкаў «Глосу Правды», які з абурэньнем адказвае:

„Тры гады мінула з часу майскага перавароту. Якая-ж розьніца між пасьлямайскім пэрыядам і папярэднім? Розьніца між імі, перш-на-перш, у поўным спакоі. За тры гады адна толькі значная забастоўка ў Лодзі. А чым-жа зьяўляецца праэкт зьмены канстытуцыі, калі не праграмаю сталага ўпараджкаваньня дзяржавы? Мы ня толькі не ганарымся адсутнасьцю ў нас праграмы, але проста маем яе. Дзяржава моцная, якая займае належнае ёй месца ў Эўропе—весь аснова нашае праграмы».

Перад эканамічным крызісам, перад ростам беспрацоўя і цэмры на вёсках—праграма, трэба прызнаць, малаасуцешная і ня вельмі сур'ёзная.

Ня дзіва з гэтае прычыны, што праграма пяцігадовага будаўніцтва, высунутая на 16-й партканфэрэнцыі не магла ня выклікаць у частцы прэсы дрэнна ўтоенае зьдзіўленьне.

У артыкуле «Перамога Сталіна» «Газэта Варшавска» наконт канфэрэнцыі піша:

„Канфэрэнцыя зацьвердзіла плян пяцігадовага будаўніцтва ў напрамку, згодным з прапановамі прыхільнікаў Сталіна. Намечана ўзмацненьне індустрыялізацыі краіны, намечана праца ў галіне сацыялізацыі вёскі шляхам будаўніцтва савгасаў і калгасаў і шляхам падтрыманьня бедных сялян (беднякоў і сераднякоў) проці заможнікаў (кулакоў).

Трэба адзначыць, сьпяшаецца растлумачыць газэта, што расейскі кулак не зьяўляецца капіталістам і багатыром, а толькі добрым гаспадаром.

Правыя, піша далей газэта, перасьцерагаюць сучасную большасьць ад вынікаў палітыкі паступова сацыялістычнай.

Для нашых „буржуазных“ мазгоў зразумела, што вуснамі правых камуністаў гаворыць звычайная ясная развага, якая разумее, што заўсёды толькі прыватная ініцыятыва і індывідуальныя гаспадаркі давалі станоўчыя вынікі. Кіраўнікі сучаснае Расеі ідуць па лініі вопытаў. Паглядзім, ці далёка завядзе іх гэты шлях».

І ўсё-ж такі, выказваючы абурэньне «вопытамі савецкіх кіраўнікоў», газэта ня можа ня прызнаць, што

«чытаючы гаспадарчы плян на бліжэйшых 5 гадоў, нельга пазбавіцца пачуцьця зьдзіўленьня перад вялічэзнымі нарысамі гэтага пляну, вялічэзнымі лічбамі капітальных укладаў, колькасьцю намеркаванае да выкарыстаньня сыравіны, ростам прадукцыі і ўсімі вывадамі гаспадарчага пляну, які літаральна зьдзіўляе.

Узьнікае толькі ў думках чытача шэраг пытаньняў: Дзе капітал, які трэба ўкласьці? Ці будуць вынікі працы такімі, як намечана ў пляне? Ці хопіць сыравіны, тавараў і сродкаў харчаваньня для правядзеньня таго, што намечана ў пляне? Праз гадоў пяць, калі дажывём і калі вытрымае савецкі лад, даведаемся, што скажа жыцьцё пра размах кіраўнікоў Расеі».

Што-ж? Пры бясплянавасьці і беспэрспэктыўнасьці, пры адсутнасьці ўсякае праграмы, характэрнай для сучаснай Польшчы, пры надыходзячым крызісе, паратункам ад якога можа служыць толькі літасьць амэрыканскага дзядзюшкі, няпэўнасьць у посьпехах суседа таксама можа быць уцехаю. Гэтае ўцехі ніхто не жадае і ня можа адабраць ад працаўнікоў польскае прэсы.

Н.

Фэльет

ЦЫБУЛЬНЫХ СПРАЎ МАЙСТРЫ

Цыбуля, наша родная беларуская цыбуля, якую вясковыя кабеты кожную вясну прадведаўскім спосабам садзяць у зямлю, а ўвосень вязуць на рынак, каб на выручаныя грошы набыць сабе квяцістую хустку і іншыя рэчы жаночага абыходу—гэта самая звычайная цыбуля ніколі ня марыла, што яна дапаможа некаторым капэратарам стаць вядомымі на ўсю БССР...

Восень 1928 году... Набліжаецца новы гаспадарчы год. Апрацоўваюцца і пераапрацоўваюцца экспартныя пляны. Разгортваюцца багатоўкі разнастайнай сыравіны...

Вось у гэту гарачыню Гомельскі райсаюз спажывецкай капэрацыі атрымлівае заданьне разгарнуць загатоўкі цыбулі для экспарту.

— Што? Цыбулю? Хе-хе-хе... Чудакі сядзяць у цэнтры! Ды дайце нам толькі дазвол, мы... ды мы ўсю заграніцу закідаем цыбуляй,—сьмяяліся гомельчане...

— Што другое, а цыбулю... гэта нам раз плюнуць,—падтрымлівалі іх працаўнікі нізавой спажывецкай капэрацыі.

І пачалі плываць, выбачайце, загатаўляць і экспартаваць...

І па вагончыку, па парачцы адпраўлялі цыбулю яны...

А там... Рыская кантора цэнтрасаюзу наняла спэцыяльныя склады, каб в „раскрытыми об'ятиями“ прыняць жаданага госьця, за якога спадзяваліся атрымаць цэлую кучу замежнай валюты.

Не падлічылі нашы цыбульных спраў майстры аднаго, што цыбуля—гародніна далікатная і любіць, каб яе перад запасам на зіму добра высушылі.

Са злосьці над галавацяпствам чан цыбуля ў дарозе пачала а ў Рызе, у канторы цэнтрасаюзу дзяць нашы-ж савецкія пр якія звальвалі яе ў склады, ня прышлі ўсе 19 вагонаў.

Замежныя-ж купцы—наро не сьпяшаліся купляць.

У выніку... У выніку—ва цэнтраў за пуд прышлося пра булю па 30. Дый тое замежн цы палохалі: «Калі, кажуць тыдзень палажыць, дык мы і таў не дамо» . . . . . .

Колькі тысяч рублёў абыш байнасьць гомельскіх капэра аб гэтым гісторыя нічога ня

Толькі на адным з апошні дзяньняў праўленьня Белк было адначана:

... «што Гомельскі райсаюз цію памылку, накіраваўшы на непрасушаную цыбулю, ча папсавалася»...

Ставіць таксама Белкаапса таньне перад цэнтрсаюзам «а нацыці на свае сродкі налавін каў»...

„Убыточки-то“, відаць, не кія...

Нам-жа дзіўна яшчэ адно.

Увесь час гаворыцца аб па ні экспарту, аб неабходнасьці ваць нашай сыравінай заг рынкі. Між тым экспартавалі наў напалову папсаванай цы ніхто адказнасьці не нясе...

Нават у пастанове праўлен каапсаюзу няма ніводнага тым, каб за нядбайнасьць, ка жыць, пагладзіць па галоўцы..

В. За

З ПАХОДУ „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУ

Чаму беднята вёскі Паўсты засталася без пасёлка?

Ліст удзельніка паходу газ. «Савецкая Беларусь».

(Слуцкі р., Бабруйшчына).

Случчыну яшчэ поўнасьцю не ахапіла пытаньне калектывізацыі, бо калі параўнаць з тымі месцамі Мазыршчыны, дзе давялося бываць выяздной рэдакцыі, дык Случчына далёка засталася ззаду. Тут яшчэ сяляне цьмяна ўяўляюць сабе ўсе гэтыя пытаньні, і мэта большасьці вёсак—выйсьці на хутары.

Тут «сталыпіншчына» ўзбаламуціла галаву ў першую чаргу працаўнікам зямельных органаў, якія некалькі год таму назад мелі «гонар» займаць пасады зямельных працаўнікоў, а ёсьць і такія, якія працуюць і зараз.

Яны якраз і захапіліся гэтай ня нашай, не сацыялістычнай формай землякарыстаньня, і 2 гады таму назад шчыра праводзілі яе ў жыцьцё, мінаючы ўсякія партыйныя і савецкія дырэктывы, накіраваныя на перабудову сельскай гаспадаркі.

Мінулыя справы зямельных працаўнікоў Случчыны набываюць сабою да некаторай ступені назву праступных спраў, бо часамі „сталыпіншчыну“ заводзілі бяз усякага жаданьня вясковай беднаты і маламоцнага сялянства.

Беднята пратэставала, абскарджвала, але ўсё гэта—як гарохам у сьценку.

У мінулым годзе скончылася земляўпарадкаваньне аднэй з буйных вёсак, якая налічвае 136 двароў—вёскі Паўстынь, Урэцкага сельсавету. Яна зьяўляецца прыкладам прымусовага пераводу на хутары.

Да сваёй рэарганізацыі ў райён Случцкая округа ўхваліла разьбіць гэту вёску на хутары. Сяляне, даведаўшыся аб падобнай пастанове, накіравалі заяву ў округу, дзе чорным па беламу пісалі, што такое земляўпарадкаваньне зьяўляецца зьдзейсьненьнем жаданьня заможнай часткі кулацтва.

Ні камісія па земляўпарадкаваньні, ні зямельны аддзел тагочаснай округі не зьвярнулі ўвагі на законную скаргу беднаты і, каб доўга не марудзіць, выслалі адразу-ж каморніка Філіповіча, які і сёньня ў поўным здароўі і росквіце сіл, відаць па-мінуламу, агітуе на Случчыне за „сталыпіншчыну“.

Філіповіч распачаў земляўпарадкаваньне, пачаў надзяляць хутарамі ўсе 136 гаспадарак, і калі некалькі гаспадароў з беднаты папрасілі выдзеліць іх на пасёлак, катэгарычна адмовіўшыся ад хутароў, Філіповіч бяз усялякіх «пагроз» сказаў: «застанецца зямля—тады адрэжу вам пасёлак...»

— «Чакай, пакуль застанецца зямля...» А,—вядома, якая застанецца, думалі беднякі,—самая горшая... Лепш ужо выйсьці на хутар...

Спытаўшыся яшчэ раз у Філіповіча, ці нельга падаць заяву куды-н атрымаўшы адказ, што з гэтаг на выйдзе беднякі пакарыліся ню земляўпарадкавацеля і акр

Філіповіч—той самы Філіпо можа часамі, паказваючы на ся цам, горача кажа: «я маю зас рад савецкай уладай, як г працаўнік,—той самы Філіпові ехаўшы ў вёску Паўстынь, і маў растлумачыць сялянам ус насьць «сталыпіншчыны». Ё пасьля земляўпарадкаваньня сьмяяцца з беднякоў, якія заяву з просьбай выйсьці на

— Дурні,—казаў ён,—каб я ўпарты ў сваім дамаганьні, ды малі-б самы лепшы кавалак зя пасёлка. Гэта нават узаконена села і звонка сьяяўся, а бедн хаючы патыліцы, думалі: «Вос новыя формы зямлякарыстань

Першай скаргай, якую пад дакцыя выяздной газэты «С Беларусь», была скарга 5-ці п скіх беднякоў, якія раніцой, ч лак, прыехалі на адным хут коніку ў рэдакцыю.

— Сьмерць на носе—што рабі пыталіся яны.—Як мы будзем на хутары?...

— А вы зьвярнуліся-б да ка ў часе зямляўпарадкаваньня, вас аб'яднаў у калектыў ці пас кажа адзін з супрацоўнікаў.

— У гэтым і бяда. Каморні повіч і слухаць не хацеў...

Мы яму даводзілі, што, вы на хутар, патрэбна на кожны студня, пастух, што мы ня што-небудзь зрабіць агульнымі Кожны павінен рабіць паасобку. усё роўна не памагло... Яно так і патрэбна, але вы н райпе, як нам арганізаваць тыў. У нас каля 10-ці б няцкіх гаспадарак жадаюць аб свае надзелы...

Вось узор зямляўпарадкаван Случчыне...

Ёсьць, як бачыце, у нас Філі для якіх „сталыпіншчына“ вы сацыялістычныя формы. Сваім ф ным, чыноўніцкім падыходам д вы яны прымушаюць праз год лей зноў перабудоўваць вёску.

Мала гэтага, яны паказваюц і тое, што сялянства часамі бол дае і лепей разьбіраецца ў пыт калектывізацыі, чым тыя, кам жыць.

А пара ўжо ведаць лінію п савецкай улады ў пытаньнях ўпарадкаваньня. Пара ведаць а зямельным працаўнікам.

Ул. Паскрэ

Падзяка анісавіцкіх сялян.

Хто гэта бачыў, каб у нашы Даманавічы прыехала рэдакцыя —з гораду на Мазыршчыну. Гэтаму ніхто не даваў веры, але бачым—едуць і спыняюцца ля хаты-чытальні некалькі фурманак, амаль ня 10 з машынаю, на якой друкуецца газэта, і іншымі прыладамі. І пашла «касавіца“. Пачулі сяляне, што прыехала самая цэнтральная рэдакцыя з Менску, будзе ўсе пытаньні тут на месцы растлумачваць і рабіць усё належнае.

*Што датычыцца сялянства, дык пачалі прыходзіць з усяго краю—з Даманавіцкага, Ліпаўскага, Зеляноцкага сельсавету, а нават і

Самакрытыка дапаможа ачысьціць апарат ад гнілі.

Кулакоў і нэпманаў выкінуць з фабрыкі.

(Фабрыка «Дняпроўская Мануфактурара»).

Галоўная роля ў правядзеньні чысткі савецкага апарату ўскладаецца на бядноту клясу, на бяднейшае сялянства.

Пасьпяхова змагацца, рабочая клясе павінна таксама прагледзіць свае рады, ачысьціць іх у першую чаргу ад ворагаў-кулацка-нэпманскага элемэнту ад гультаёў, хуліганаў і наогул усіх, для каго не ў інтарэсах рабочых працы. Ня гледзячы на тое, што шмат дырэктыў аб вывучэньні ворожага складу рабочых на прадпрыемствах, у нас да апошняга часу ня зроблена ў гэтым напрамку. Таму ў нас маюцца такія асобы, якія падлягаюць чысткі.

Ілун Косон працуе ў якасьці загадчыка матальнага аддзелу. Да самай апошняй рэвалюцыі і пасьля ён буйны ўласны мануфактурны магнат. Ён зьдзекаваўся над рабочымі, якія куплялі тавары ў яго краме. Ён працуе адказным сакратаром сыраматальнага савету. Рабочыя зьдзіўляюцца, як гэта такі былы гандляр цяперашні абраны ў прафсаюзу.

Ніпкін Гірша да самага 1925 года буйны ўласны мануфактурны магнат, цяпер сябра саюзу—рабочы, працуе савецкіх спэцыялістаў, якія цяжкасьці ў таваразабясьпечаньні тлумачыць рабочым з погляду сваёй спэкулянцкай ідэалёгіі. І што вы думаеце, у нашых фабрычных арганізацыяй ён дронны? Ніколькі. Фабком хадайнічае аб выдачы яму, Цыпкіну, 75 р. з фонду ФУБР'а на паездку на курорт. А рабочыя, якія дзесяткі год працуюць на фабрыцы, гэтакай нашаны ад фабкома ня маюць, як гэты спэкулянт.

Гутараў Піліп мае зямлі 15 дзесяцін, плаціць сельгаспадатку 100 р., мае батракоў, а сам каторы год працуе на фабрыцы, атрымоўваючы па 90 р. у м-ц.

Головічэр Доня атрымоўвае 135 р. у м-ц. У годы разрухі, спэкуліраваў, сьміяўся над рабочымі, якія зарабілі па паўтары пуды бульбы у месяц. Головічэр купіў сабе „домік", які каштуе па прыблізных падліках 8000 р., ад якога цяпер ён мае прыбытку ад кватэрнай платы 120 р. у м-ц.

Гоз Мендзель былы буйны кантрабандыст, быў аштрафаваны РВК за гэта на 10000 р., атрымаў па суду год умоўна, працуе на фабрыцы, атрымоўвае 130 р. у м., мае рабочых наогул, а палякаў—рабочых заве польскай мордай.

Фрадкін Залман сын ляднянскага гандляра мясам, пазбаўленага выбарчых правоў, працуе на фабрыцы і трэба чакаць скора будзе сябрам саюзу.

Трэба ачысьціць фабрыку ад нэпманска-кулацкага элемэнту. **Бядняк.**

МОЖНА ПАКІДАЦЬ ЯГО НА ПРАЦЫ?

Гаспадарчык начальніка ст. Гарочыцы Часгунак Асаўляк на працягу 2-х год сваёй абавязкі загадчыка агенцтва і касы ашчаднасьці. Ня выконваў гэтых абавязкаў, а псаваў іх. Ці ці можа Асаўляк выконваць свае абавязкі, калі ён кожны дзень п'е? Падпіскі на газэты ён ня прыймае, бо гэта—ён казаў—справа лішняя, маркі прадаваць — таксама. Касу ашчаднасьці ён грошы прымаў ад тых, хто меў вялікую „нагрузку" і ўціснуцца да яго на кватэру, цішэйшы, таго праганяла з пакоя жонка Асаўляка. Не вялікае было і тых, хто працінуўся ён здаў, бо процанты на іх ня пачыналі расьці. Я, напрыклад, 12-IV—29 г. 82 руб. грамадзкіх і напрасіў запісаць іх на кніжку сяноцкага с.-с. 12-IV—1929 г. Прыйшоў да мяне Асаўляк і просіць мне казаць, што я здаў грошы, грошы ён прапіў, а зараз да яго Часгунак кантроль і калі даведаецца, ему будзе дрэнна. Я сказаў, што нікому не сказаць я ня маю права. Заявіць сельсавету і кантролю ня было магчымасьці, бо с.-с. быў на пленуме, а кантроль пашоў на кальцу. Прышлося чакаць.

15-IV—29 г. Асаўляк атрымаў пэнсію і прыйшоў назад мне грошы і, прынёсшы, сказаў, што кантроль пошту і касу ад яго забраў, а таму ён ня можа запісаць на кніжку. Аказалася, што, апроч здадзеных мною грошай, Асаўляк абегаў усю станцыю і пазычаў грошы, каб расквітацца з агенцтвам, калі кантроль забіраў справы.

І так два гады жыў Асаўляк агентам, ня прыносячы карысьці, але жыў і быў у пашане ў Калінкавіцкай пошты.

Зараз Асаўляк яшчэ працуе памоцнікам начальніка ст. Гарочыцы Часгунак. Ці ня трэба было-б выкінуць такога працаўніка зусім, бо ён можа прапіць станцыённую касу? Трэба паставіць пытаньне перад чыгункай: ці можна пакідаць такога працаўніка на працы? **Лявонік В. Л.**

Трэба вычысьціць чужы элемэнт.

(М. Ляды, Аршанскай акругі).

Калі мы зьмяняем сьпіс гандляроў і абшарнікаў, якія пралезьлі ў якія навучальныя ўстановы, для мэты адведным арганізацыям у ліквідацыі іх для ачысткі ад гэтага элемэнту.

У Чырвонінскім лясьніцтве, Аршанскай акругі, працуе рахункаводам нейкі Рудзка, які зьяўляецца былым Ляднянскім прыставам, **Адамовічам** (зьмярозьвішча).

Ляднянскім аддзяленьні дзяржпрадпрыемствы, жыве на ўтрыманьні сельсавету па загатоўках слугі, гр. **Соркін**, былы фруктавы гандляр, утрымаў біліярдную, зараз наймае ён на службу падзённую работу на прафсаюзу гандляроў, пазбаўлены выбарчых правоў.

У Горацкай акадэміі на апошнім курсе вучыцца **Хазанаў**, яго бацька трымае піўную, пазбаўлен выбарчых правоў.

У г. Воршы ў працэлектыве панчошніц працуе гр. **Міхліна Бася**, пазбаўленая выбарчага права; яе бацька гандляр у м. Ляды.

Таксама ў прафсаюзы пралезьлі дочкі гандляроў, як гр. **Фрадкіна Бэйля**, у саюзе швэйнікаў ужо 2 гады, беспрацоўная, жыве на ўтрыманьні бацькі гандляра-мясьніка, гр. **Кроль Рая**, таксама беспрацоўная, у саюзе савгандслужачых, жыве на ўтрыманьні брата-гандляра. Пазбаўлена выбарчага права.

«Кавалерыя».

Дарожна-будаўнічы апарат неабходна чысьціць.

(Ад нашага полацкага карэспандэнта).

Работа па дарожным будаўніцтве ў мінулым годзе паказала, што мелася шэраг няўважлівых і злачынных адносін з боку працаўнікоў. Выпадкі хабарніцтва, імкненьні да нажывы, ашуканства рабочых пры разьліках, прыняцьце на працу „сваіх людзей", нядбайныя адносіны да вытворчасьці—усё гэта мела некаторае месца ў мінулым годзе на Полаччыне.

Досыць сказаць, што 8 дарожны вучастак растраціў 23000 з лішнім рублёў, назіралася фабрыкацыя падлогаў, непаградкі ў працы, шчыльная сувязь з прыватнікам, падарункі сельсаветам пры зацьвярджэньні подпісаў. Праўда, вінаватыя ў гэтым панесьлі належнае пакараньне.

Як-жа ў нас абстаіць справа зараз? Трэба сказаць, што вельмі і вельмі дрэнна. Галоўнае,—дарожна-будаўнічы апарат мае такіх асоб, якім зусім не павінна быць месца ў нашым савецкім апараце.

У Полацкім акруговым дарожна-будаўнічым вучастаку ў апараце ёсьць сьмяцьцё, ёсьць злачынныя элемэнты, растратчыкі.

Былы загадчык тэхнічнае часьці акруговай паштова-тэлеграфнай канторы Дымаи, сын папа, зараз працуе дзесятнікам вучастку. Да гэтага часу Дымаи меў шчыльную сувязь з загадчыкам акрканторы Грыбачом, які растраціў каля 6000 р. Аб ім у свой час пісала „Савецкая Беларусь", адзначаючы яго злачынласьць, безгаспадарчасьць і нядбайнасьць.

Ерманоў, былы старшыня рабачкому, член партыі, растраціў каля 300 руб. членскіх узносаў, сыстэматычна п'янствуе, але побач з гэтым працуе ў дарожна-будаўнічым вучастку. Мусіць, у яго ёсьць надзвычайна добрыя знаёмыя з адміністрацыі, якая не зваліне Ермакова з працы.

Новікаў, Чарняўскі і Франк. Гэта тройка „добрых" працаўнікоў: першы сыстэматычна наладжвае п'янкі, вялікі падхалім, заўсёды імкнецца „падысьці" да начальства; другі—былы растрачык, а ў Франка раней была маленькая пасада—ён быў толькі... валютчыкам, спэкулянтам на чорнай біржы ў Полацку.

Зусім інакш абстаіць справа з дарожным майстрам Ярмолчыкам. Ён, бачыце, таксама „добры" працаўнік, вядзе сваю справу, але... бываюць маленькія памылачкі: прыняў на пасаду старшага рабочага папа Карвецыага, які, бязумоўна, ня можа зьяўляцца нашым сумленным працаўніком. Мусіць з такога пункту погляду прымае на працу майстар Ярмолчык і іншых працаўнікоў.

Машыністкай у дарожна-будаўнічым вучастку працуе нехта Геня Штэйцэнг, якая, праўда, займае невялічкую пасаду, але зьяўляецца дачкой гандляра і трымае з ім шчыльную сувязь. Яна прынята на працу па добраму знаёмству і сваёй саліднасьці...

Цяпер некалькі слоў аб працаўніках 20 дарожна-будаўнічага вучастку. Вось гэрої з гэтай багатай установы: дзесяцкі Базараў сыстэматычна п'янствуе; дарожны майстар Валчок п'яніца, за розныя злачынствы выключан з камсамолу; дарожны майстар Краеьна таксама сыстэматычна п'янствуе; Рухлевіч мае за сабой злачынства, б'е сваю жонку; Хуціі і Сьмеценка—ніколькі не адстаюць ад вышэйпаказаных асоб.

На вялікі жаль, гэтым наш дарожна-будаўнічы апарат не абмяжоўваецца: там ёсьць яшчэ шмат растрачыкаў, злачынцаў, п'яніц, шкоднага элемэнту, якія сваёй дзейнасьцю падрываюць сацыялістычнае будаўніцтва.

Надаючы вялізарнае значэньне дарожна-будаўнічай справе ў гэтым годзе, мы павінны дабіцца, каб дарожны апарат на Полаччыне быў з добрых працаўнікоў, каб пасьля чысткі не засталося ніводнага растратчыка, злачынцы, п'яніцы, ашуканца сялян, лодыра, хабарніка. Аб гэтым павінна паклапаціцца АКК-РСІ, якая пачынае з мая праводзіць чыстку савецкага апарату.

Андрэй Дудка.

Ачысьцім установы ад панскіх паслугачоў

(Горні, Аршанскае акругі).

Вельмі часта здараюцца такія выпадкі, што ў нашы ўстановы пралазіць чужы нам элемэнт, што выклікае абурэньне з боку насельніцтва.

Фактам, што нашы ўстановы сабесу аказваюць дапамогу чужому элемэнту, можа служыць Горацкая страхкаса. „Лёгкая кавалерыя" пры сельска-гаспадарчай акадэміі зрабіла „налёт" на Горацкую страхкасу і высьветліла, што былыя царскія служакі і палітычныя працаўнікі савецкае ўлады атрымоўваюць дзяржаўную пэнсію па інваліднасьці.

Так, напрыклад, Лінкін — былы ўласьнік аптэкі атрымоўвае дапамогу па інваліднасьці ў разьмеры 51 руб. 36 кап. Лейтнер—былы вайсковы начальнік, атрымлівае 22 руб. у месяц. Васькоўскі—былы служачы жандармэрыі, пазбаўлены выбарчых правоў, з 1927 году атрымлівае з страхасы пэнсію ў суме 16 р. 65 к.

Трэба больш увагі аддаць праверцы складу пэнсіянэраў нашых стракас і каго належыць пазбавіць пэнсіі

Т. Ст—іч.

Справавод Лагойскага РВК чакае чысткі.

У 1928 годзе сакратаром Падонкаўскага сельсавету пачаў працаваць камсамолец Янка Сенюковіч. Прыняўшы справы, Сенюковіч адразу пазнаёміўся з кулакамі і зрабіўся іх абаронцам.

У чэрвені 1928 году, будучы ў камісіі на праверцы захаваных аб'ектаў абкладаньня, Сенюковіч разам з камісіяй склаў шмат пратаколаў на захаваньне аб'ектаў абкладаньня на кулакоў Іёдку, Казлоўскага і тых, якія плацяць падатку на 600 р. з гаспадаркі, але, уменце, пратаколы ў РВК накіраваны ня былі, і ад штрафу кулакі вызваліліся ў той час, як на сераднякоў быў накладзен штраф, і яго спагналі.

Дзейнасьцю Сенюковіча абураны беднякі і сераднякі, але, ня гледзячы на такое злачынства Сенюковіча, якога суд засудзіў на шэсьць месяцаў зьняволеньня, аслабаніўшы ад пакараньня па амністыі, Сенюковіч, замест звальненьня з пасады сакратара, пераведзен і працуе на вышэйшай пасадзе—справаведам Лагойскага РВК.

Пабачым, што скажа камісія па чыстцы савецкага апарату. Д. К.

Аб'ездчык-хуліган.

У Сваташыцкім лясьніцтве (Дубровенскі раён Арш. акр.), працуе б. аб'ездчык гр. Тарасэвіч (цяпер ён загадчык усіх нованасаджаных дзялянак Сваташыцкага лясьніцтва).

Летась ён п'яны і яго памоцнік—лясьнік 19-га абходу Пазьнякоў зьбілі селяніна в. Коршыкава, Ляднянскі р., які вартаваў сваё жыта.

Акрамя таго, гр. Тарасэвіч п'яны валяўся каля трох дзён на гародах вёскі Асташковіч.

Гр. Тарасэвіч таксама часта заязджае да кулака Тосіна Андрэя з вёскі Ірваніца (Ляднянскі раён), які з дапамогай „сваіх сяброў" пралез у сябры с-с., дзе ў двох п'юць каля трох дзён. Сялянства абурана такім савецкім служачым.

Рудна.

Вайскораўскі наступ за ўздым гаспадаркі.

ВАЙСКОРЫ АБВШ НА ЗАВОДЗЕ „ЭНЭРГІЯ".

Вайскоры 2-й і 3-й рот Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы зрабілі „налёт" на свой сатаварыскі завод „Энэргія". Вайскораў, прыняўшых удзел у „налёце" было 41. Уся група была разьбіта на дзесяць падгруп, па ліку тых месцаў на заводзе, якія вайскоры павінны наведаць.

Зьявіўшыся на завод, вайскоры разыйшліся па прызначаных ім цэхах і пачалі сваю працу. У таварыскіх гутарках з рабочымі і прадстаўнікамі адміністрацыі вайскоры выявілі многа станоўчых і адмоўных бакоў у працы заводу. Каб упэўніцца ў праўдзівасьці таго, што адказвалі на запытаньні вайскораў рабочыя і адміністрацыя, прыходзілася пытацца аб адным і тым-жа ў некалькіх асоб, і калі між іх адказамі ўзьнікалі якія-небудзь супярэчнасьці, зьвярталіся за канчатковым адказам да сакратара партыялектыву, ці выводзілі сярэдняе.

Трэба адзначыць, што рабочыя і адміністрацыя адказвалі на пастаўленыя ім пытаньні так, як яно ёсьць, і непагоджаваньні ў адказах ня было. Гэта гаворыць за тое, што да вайскораў аднесьліся з давер'ем.

У рабочай сталоўцы заводу прытулілася рэдкалегія насьцэнгазэты, задачай якой было ўсё заўважанае вайскорскім вокам на заводзе тут-жа, на месцы, адбіць у газэце. Праз хвілін сорак пасыпаліся заметкі. Увесь матар'ял вайскораў у насьцэнгазэце не ўдалося зьмясьціць з прычыны абмежаванасьці часу і буйнага ліку заметак.

Аб чым-жа гавораць гэтыя заметкі? Іх зьмест можна падзяліць на дзьве часткі: станоўчыя, адмоўныя бакі ў працы заводу.

Пастараемся ахарактарызаваць усю працу заводу на падставе матар'ялу, які далі вайскоры.

Падняцьце вытворчасьці працы.

Ліцейны цэх у 1925 годзе рабіў адліў чыгуну ў 2 тыдні 3 разы, што складала ўсяго 600-700 пудоў, а ў 1928-29 годзе адліўка праводзіцца ў два тыдні 6 разоў і складае 800-900 пудоў. Прагулаў ва апошні час амаль-што няма, калі ня лічыць спазьненьня на работу і ня яўку ў рэлігійныя сьвяты. Рабочыя ліцейнага цэху з гордасьцю кажуць: «У нас раней было шмат прагулаў, а цяпер няма, быў адзін прагул, але і той даўно».

Няяўку рабочых на працу ў сьвяточныя дні і спазьненьне трэба аднесьці да недахопаў працы гуртка бязбожнікаў, які, сам думаючы папасьці ў рай ад бяздзельля, нічога ня робіць. Частка рабочых вінаваціць у гэтым адміністрацыю: дагэтуль на заводзе няма клюбу, і таму антырэлігійная праца не вядзецца. Самым яскравым прыкладам адсутнасьці антырэлігійнае працы зьяўляецца тое, што на аднаго рабочага-паляка, які на пасяджэньні гарсавету ўнёс прапанову скарыстаць касьцёл пад клюб, з боку старых рабочых узьнята праследваньне, нават пагрозы.

Вытворчыя нарады праходзяць з удзелам рабочых, але некаторая частка рабочых на нарадах баіцца крытыкаваць недахопы адміністрацыі, абходзячы часам важнае пытаньне маўчанкаю. Завод прымае ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве—прыняў вызаў „Выбаржца" і выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва завод „Камунар",

Аднак, на заводзе заўважаны выпадкі несьвядомасьці рабочых у неабходнасьці ўзьняцьця вытворчасьці. „Я ў дзень шмат больш магу намаляваць вагаў,—кажа адзін рабочы вагарнага цэху,—але ад гэтата мне плата не расьце". Вытворчы плян выконваецца заводам на ўсе сто процантаў.

Зьніжэньне сабекошту.

Да зьніжэньня сабекошту завод імкнецца, але гэта справа ажыцьцяўляецца слаба. Ёсьць многа браку ў ліцейным цэху. Значны лік браку часткова залежыць ад адміністрацыі і часткова ад саміх рабочых. Выпісаная з Нямеччыны машына спэцыялістамі ня была вывучана і пры першым яе выпрабаваньні дала шмат браку. Яшчэ прыклад: падлівалі шкіф, і не хапіла чыгуну. Шкіф прышлося ламаць і пераплаўляць нанова, што абышлося каля 300 руб.

Удзел у пасеўнай кампаніі.

Была вылучана рабочая брыгада з 3-х чалавек—двух кавалёў і аднаго малатабойца ў падшэфную вёску Зазер'е, дзе яна працавала два тыдні.

За гэты час брыгада зрабіла 2 новых і адрамантавала 21 старых плугоў, адну новую і 15 старых барон і шмат іншага. Сяляне в. Зазер'е вельмі здаволены такою дапамогаю і вынесьлі калектыўную падзяку заводу.

Камсамольцы наладзілі суботнік, у якім прымалі ўдзел і старыя беспартыйныя рабочыя; сродкі пашлі на рамонт с.-г. машын для вёскі. Гэту форму сувязі рабочых з сялянамі трэба заказыць рабочым і другіх заводаў.

І апошняе, што адзначана вайскорамі, гэта недастатковая ўвага ваенізацыі; не разгорнута праца па вярбоўцы ў вайсковыя школы рабочай моладзі; ня зрушана з месца справа беларусізацыі—рабочыя ня хочуць гаварыць пабеларуску, а партыйцы ў гэтым ня служаць прыкладам; да гэтага часу рабочыя ня маюць на руках калектыўнага дагавору.

Узаемаадносіны рабочых з адміністрацыяй, згодна слоў рабочых, добрыя. Доказам гэтага зьяўляецца чуласьць адміністрацыі да прапаноў рабочых: з 82 прапаноў не праведзены ў жыньцё толькі шэсьць.

Заработак рабочым выплачваецца своечасова. Дырэктар заводу—партыец, вылучэнец-рабочы, які карыстаецца сярод рабочых аўтарытэтам.

Ж. Мігрэй і Р. Патроўскі.

Вайскораўскі актыў „налятае".

(№-скі стр. полк).

20 красавіка ў 13 гадзін склікаецца вайскораўскі актыў палка.

Актыў робіць „налёт".

«Налёт» пачынаецца з азнаямленьня загадам. У загадзе пішацца: «На фронце паходу за ўраджай, сацыялістычнага спаборніцтва, падрыхтоўкі да лягераў і стралковай падрыхтоўкі.

Ворагі, на якіх налятаем: падшэфны Грэбянецкі сельсавет, Чэрвенская сельская і крэдытнае таварыствы, саюз рабземлесу, саюз прац. асьветы, палк. школа і рота малодшага камскладу тэрміновай службы. Для правядзеньня вайскораўскага налёту на вышэй паказаныя рубяжы загадваю,—скласьці 6 ударных груп па 3-4 вайскора, узброіцца алоўкам, блякнотам, паперай, форма вопраткі паходная.

У 13 гадзін 35 хвілін пачаць штурм паказаных рубяжоў. Першай групе пад камандаваньнем вайскора арганізатара палка на кірунак селькрэдыт. таварыства, 2-й—на падшэфны сельсавет, 3-й пад камандаваньнем маім на саюз прац. асьветы, 4-й туды та і 5-й туды та. „З захопленымі трафеямі к 16-ці гадзінам сьцягнуць атрады к штабу вайскораўскага палка—клюбу палка".

Гадзіньнік стукнуў 13 гадзін 35 хвілін. Групы рушыліся ў паход і накіраваліся ў розныя напрамкі гораду. Усе вісёлыя і бадзёрыя.—Эй, тав. камандзір другое групы, калі будзе няўстойка на вашым фронце, дык паведаміце, падтрымаем з крыла, або з тылу, усё роўна вораг уздрыгне.—Добра, натое мы і вайскоўцы, каб сувязь добрую трымаць.

Праз некалькі хвілін групы ў мэты... Мы прышлі да вас згодна вось гэтай паперы і падаецца ў рукі таго ці іншага загадчыка выпіска з загаду аб вайскораўскім налёце. Нейкі час напружанай цішыні, дык значыцца налёт. А так, налёт. А няўжо вы праз газэты да гэтага часу нічога ня ведалі аб ім? Дык што-ж вам патрэбна? Вось у першую чаргу раскажэце, што вы зрабілі ў справе падняцьця ўраджайнасьці і сацыялістычнага будаўніцтва. Завязваецца жывая гутарка. Запісвае. Праведзена цэлы шэраг гутарак па падняцьці ўраджайнасьці, сабрана 58 пудоў попелу, прададзена 58 плугоў, 4 «трыеры», барон—6 і г. д. А ці ўсе члены таварыства ведаюць задачы партыі і пастановы савецкай улады ў галіне калектывізацыі вёскі і новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку. Пытаньне за пытаньнем даецца з боку штурмуючай групы. А далей гутаркі з членамі таварыства і асобнымі сялянамі.

16 гадзін. Групы сьцягнуліся к штабу, падвялі вынікі.

Я. Бароўскі.

Вынікі вайскораўскага „налёту" на падшэфны сельсавет.

Нашай вайскораўскай групай, якая рабіла „налёт" на падшэфны Грэбянецкі сельсавет па пытаньнях уздыму ўраджайнасьці, высьветлена наступнае:

Сельсаветам сумесна з шэфамі-вайскоўцамі №-га палка амаль на ўсіх вёсках праведзены сходы сялян, дзе было растлумачана сутнасьць узьняцьця сельскае гаспадаркі і павялічэньня ўраджайнасьці; але побач з гэтым слаба праведзена праца па растлумачэньні сялянам новага закону аб сельска-гаспадарчым падатку.

У справе чысткі насеньня праца была разгорнута. За 3 з паловай тыдні з 664 гаспадароў сельсавету ачысьцілі насеньне да пасеву 462, і ёсьць надзея, што да сяўбы будзе ачышчана насеньне на ўсе 100 проц. Дрэнна тое, што на ўсім сельсавеце працуе толькі адзін трыер, а „трыумф", даўдзены шэфам—№-м палком, стаіць бяз руху. Вестак аб колькасьці ачышчанага насеньня як у сельсавеце, так і ў камітэце ўзаемадапамогі няма. Па чутках, весткі мае сябра крэдытнага таварыства-правадзік трыеру. Насеньне чысьцяць беднякі і сераднякі.

Па ўсім сельсавеце закантрактавана толькі 4 гаспадаркі, бо недастаткова растлумачана насельніцтву карысьць катрактацыі. Зусім дрэнна вядзецца праца па ўцягненьню ў калгасы, а думка аб арганізацыі іх ёсьць у сялян. Слаба вядзецца праца камітэтам узаемадапамогі ў сэнсе здавальненьня беднаты насеньнем. Камітэт мае ўсяго 64 пуд. насеньня, а запатрабаваньні беднаты вялікія.

Штучнае ўгнаеньне ў сельсавеце зусім яшчэ ня ўжывалася, а патрабаваньні з боку сялянства на ўгнаеньні вялікія. Ячэйка ЛКСМБ мала чаго зрабіла адносна ўзьняцьця ўраджайнасьці. Камсамольцы не зацікаўлены гэтым пытаньнем і толькі абмяжоўваюцца назіраньнем за зборам попелу, якога сабрана вельмі мала. Характэрным зьяўляецца тое, што ва ўсім сельсавеце няма ніводнага плякату, лёзунгу і кніжкі аб ураджайнасьці і сельска-гаспадарчым падатку.

Салаўёў.

Б'ём трывогу, ставім пытаньне...

Доченьки, сынки маменек, папенек" буйных гандляроў, спэкулянтаў, адвакатаў, контрэвалюцыянэраў, кантрабандыстаў нашлі сабе цёплы прытулак у камсамоле, тэхнікумах, рабфаках, ва унівэрсытэтах, на фабрыках і заводах.

(*Ад нашага полацкага карэспандэнта*).

Справа абстаіць так: калі Кастрычная рэвалюцыя ўзяла ўсю ўладу ў свае рукі, калі пралетарыят стаў гаспадарам, тады «доченькам, сынкам маменек, папенек», контрэвалюцыянэрам, кантрабандыстаў, буйных спэкулянтаў, гандляроў цесна стала жыць пад вялічкім правінцыяльным гор. Полацку, дзе з пачатку Кастрычніка ня хапала амаль што ніякіх навучальных устаноў, ня было буйных вытворчых прадпрыемстваў, бо яны знаходзіліся ў належным парадку. І вось—выкінутыя з пакаваных асобы, дзеці ворожага элемэнту, сталі шукаць, прабіваць сабе «окно в Европу», альбо шукаць лепшых шляхоў у лепшае цёплае для іх жыцьцё. Здарылася гэта вельмі проста. Яны паехалі па многіх гарадох неабдымнай зямлі Савецкай і там, як «лучшие из лучших» пасьцілі ў тэхнікумах, рабфаках, у унівэрсытэтах, на лепшых фабрыках і заводах. Каб ня быць галаслоўнымі, я прыведу дзесяткі фактаў, якія даюць пацьвярджаюць вышэйсказанае. Вось яны, чытайце, паважаны чытач!

Сьвярдлова Хая. Яе бацька ня даўно быў буйным гандляром у Полацку. Абкладаўся рознымі падаткамі, здаваў у арэнду кватэры, займаўся ў час кантрабандай, за што з сям'ёй быў высланы за межы Савецкай Расіі ў адміністрацыйным парадку. Сьвярдлова Хая ў Полацку скончыла другую ступень. Увесь час была цесна зьвязана з ворожым элемэнтам. Бацькі пазбаўлены выбарчых правоў. Яна знаходзіцца ў гор. Ленінградзе і заяўвала там вялікі аўтарытэт. Яна ўступіла ў камсамол, выявілася ня дамостилась на советскую платформу, яе абралі делегатам на 8 усесаюзны камсамольскі зьезд, там нават прагнулі ў прэзыдыум. Але... але поўная камсамольская дэлегацыя, якая была на зьезьдзе, дала Сьвярдловай адвод і патрабавала, каб яе выключылі са складу зьезду. Здаецца, на гэтым справа не закончылася. Зараз Сьвярдлова Хая разам з сваім родным братам працуе ў Ленінградзе на буйным заводзе...

Бэрмант Роза. Яна крыху разумнейшая за Сьвярдлову Хаю. Яна не паехала ў «чужый» Ленінград, замяніўшы апошні фабрык. імя т. Ногіна ў Маскве. Бацька яе мае вялікую па вытворчасьці ў горадзе фатаграфічную майстэрню з некалькімі рабочымі, якіх, бязумоўна, эксплёатуе. Ён плаціць сотні падатку і інш. збораў. Наконт Розы два разы ставілася пытаньне аб выключэньні з шэрагаў КСМ, як ворожую нам асобу. У часе летняга адпачынку яна прыяжджае ў Полацак, дзе зьвязваецца з ворожым элемэнтам і кажа аб тым, што „я имею неимоверный вес на фабрике Ногина, меня все знают и все защищают". Бацькі пазбаўлены выбарчых правоў.

Ліхтэрман О. і Фаня. Яны сталі камсамольцамі, працуюць на ленінградзкім буйным вытворчым прадпрыемстве. Бацька меў вялікую жалезную краму, мае патэнт, абкладваецца вялікімі падаткамі; зараз мае добрую калёсную майстэрню, якая славіцца на ўсю Полаччыну; пазбаўлен выбарчых правоў.

Каган Абрам. Жыве, працуе на вытворчасьці ў Харкаве. Уступіў у камсамол. Вядомы ў Полацку, як хуліган, п'яніца, элемэнт, які разлажыўся. Калі прыяжджае ў Полацак, дык абавязкова ў п'яным выглядзе „наведвае" акруговую міліцыю.. Бацькі яго зараз гандлююць, нават на шырокую нагу, пазбаўлены ў правох. Каган Абрам бацькоў усялякімі спосабамі падтрымлівае.

Штэйнцайг Зяма. Бязумоўна, стаў «актыўным» камсамольцам, нават маладым рабочым маскоўскага буйнага заводу „Большавік". Назначаным вялікім ворагам. Бацькі яго да мінулага году мелі буйны гандаль, займаліся ліхварствам. Зараз яны за «гандлярскія справы» арыштаваны.

Ленька Гельштэйн. Ён зрабіўся багатым чалавекам, сябрам КСМ і пралез у партарганізацыю. Бацькі яго маюць вялікую гасьцініцу. Да рэвалюцыі, апрача гасьцініцы, мелі вялікі транспартны перавозны абоз, ад якога, бязумоўна, „кошельки лепили". Зараз пазбаўлены ў правох; маюць багаты, прыгожы дом.

Славін І. і Рубашкін Саламон. Камсамольцы, працуюць у Ленінградзе. Апошні нават прыстроіў на цёплае месца сваякоў. Славін да мінулага году гандляваў, зараз мае гасьцініцу, пазбаўлен у правох. Рубашкін не адстаў ад Славіна, але ён гасьцініцу замяніў заежджым домам. З бацькамі трымаюць шчыльную сувязь.

Мармур А. таксама пралез у камсамол, жыве ў Ленінградзе. Бацькі яго да мінулага году трымалі вялікі магазын. Плацілі вял. падатак. Адзін з братоў пераехаў у Ленінград, дзе таксама распачаў сваю гандлярскую дзейнасьць. Усе пазбаўлены выбарчых правоў. Ёсьць зьвесткі, што родныя Мармура таксама нашлі сабе цёплы прытулак разам з ім.

Баркан Файвуш. Камсамолец. Знаходзіцца на заводзе ў Ленінградзе. Сваякі яго мелі буйную мучна-фуражную краму. Плацілі вялікі падатак. Маюць добры ўласны дом, які сыстэматычна здаецца ў арэнду. Пазбаўлены ў правох.

Маерава Сімха. Яна дачка буйных гандляроў Маеравых, якія знаходзяцца ў м. Валынцох, дзе разгарнулі сваю дзейнасьць дапамагаючы сваёй дачцы. Сімха нашла сабе прытулак не ў Ленінградзе, а ў Менску—вучыцца ў **Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце.** Часта прыяжджае да бацькоў, трымаючы сыстэматычную з імі сувязь.

Жэня Нахамчык. Вучыцца ў Віцебскім Яўрэйскім Тэхнікуме. Яна сама паходзіць з гр-н с. Лупачарскага, Валынецкага раёну. Там, у бацькоў, усё добра, усё ў належным парадку. Яны маюць буйны гандаль і прыватны млын, які можа „кормить нас весь век". Бязумоўна, пры такіх матар'яльных умовах Жэнечка з посьпехам скончыць...

Рабіновіч Барыс. На справе Рабіновіча трэба звацъ не Барысам, а „миленьким Борькой". Так яго завуць сваякі. Але гэта між іншым. Словам, ён працуе на вытворчасьці ў Ленінградзе. Кажуць, што за апошнія часы „нашего Борьку выдвигают в ответственное, с портфелем, значит". Бацькі да Кастрычніка мелі вялікую славу—яны багачы, мясьнікі, гандляры, спэкулянты мукой, мануфактурай, кантрабандысты, контр-рэвалюцыянэры, валютчыкі.

Драпкін І., Піратынскі Г., Эмануэль М., Эмануэль Ісак і Гіндзін. Усе яны знаходзяцца на цёплым месцы ў Ленінградзе. Першы меў гандлёвую краму, зараз мае майстэрню, пазбаўлен у правох. Другі стаў камсамольцам. Бацька мае добры млын, плаціць вялікі падатак, зьвязан з нэпманамі і пазбаўлен у правох. Трэці працуе на тэкстыльнай фабрыцы, бацькі маюць прыватную майстэрню, пазбаўлены ў правох. Апошні—Гіндзін—мае заежджы дом, сёстры выключаны з камсамолу, як ворожыя, але паехалі ў Ленінград; бацькі пазбаўлены ў правох.

Зайдзін Д. Лічыцца камсамольцам, працуе на фабрыцы „Светлана". Яго сястра, камсамолка Зайдзіна Роза, вучыцца ў школе ФЗУ на заводзе „Электросила". Бацька да рэвалюцыі быў вядомым адвакатам, меў шыкарнейшую гасьцініцу. Кватэры здаюцца ў арэнду. Сам заяваў у Ленінградзе належны аўтарытэт.

Коц. Яна, бачыце, ужо „студенткой стала", вучыцца ў Ленінградзкім інстытуце камунальнай гаспадаркі; для яе „место очень даже подручное". Сваякі мелі ў гор. Полацку самы буйны маскацельны гандаль. Буйныя дамаўласьнікі. Да рэвалюцыі лічыліся купцамі другой гільдыі, зараз здачынілі майстэрню; пазбаўлены ў правох. У часе вакацыі Коц прыяжджае да бацькоў, дзе зьвязваецца з варожым, нэпманскім элемэнтам.

Бр. Менлеры. Жывуць у Ленінградзе, таксама студэнты. Бацькі маюць буйную паляровую краму і плацяць вялікі падатак. Прыяжджаюць „навестить скучный, грязный Полоцк, с телячьим белорусским языком". Трымаюць шчыльную сувязь з нэпманамі.

Сіняковы. Брат і сястра. Апошняя вучыцца ў маскоўскім пэдтэхнікуме. Брат працуе на вытворчасьці. Абкладаецца вялікім падаткам, маюць дамы, якія сыстэматычна здаюць у арэнду. Самі належаць да варожага элемэнту.

Сьвярдловы. Іх два. Вучацца ў навучальных установах г. Ленінграду. Да 26 г. займаліся сыстэматычным гандлем. Абкладаліся рознымі падаткамі. Свае дамы здаюць у арэнду, ад чаго атрымліваюць добры прыбытак.

Буцневіч Зоя. Яна зараз ня простая полацкая грамадзянка, а „московская пролетарская (?) студентка". Яна нічуць не адрозьніваецца ад бр. Сьвярдловых, сваякі пазбаўлены ў правох.

За немагчымасьцю пералічыць займаемыя пасады, маемасьць, пра мінулае мы зараз будзем пісаць вельмі коратка. Усе ніжэйпамянёныя асобы належаць да былых гандляроў-спэкулянтаў, варожага элемэнту, якія зараз нашлі сабе прытулак у навучальных, нават вышэйшых установах.

Шалман Ш. А. і М. А. Ленінградзкія студэнты, гандляры першай гільдыі. **Леў**, іх трое, вучацца ў Ленінградзе, дзеці гандляркі; бацькі пазбаўлены ў правох. **Шульміны:** дзьве сястры, адна вучыцца ў мэдтэхнікуме, другая на рабфаку: дзеці буйных гандляроў; знаходзяцца ў Ленінградзе, **Мільнер Яўхім і А.** Першы вучыцца ў Пуцейскім інстытуце. Бацькі—буйнейшыя спэкулянты, валютчыкі і кантрабандысты; зараз маюць вялікі завод, з дзесяткамі рабочых, трымаюць сувязь з варожым элемэнтам: нэ

Новы ганебны ўчынак.

(Ад нашага карэспандэнта).

3-га мая бабруйскі дрэваапрацовачны камбінат быў сьведкаю новага ганебнага ўчынку, ахвяраю якога зьявіўся рабочы Фішман.

Пасьля працы рабочы Левін і Фішман пачалі перапранацца і жартам кідаць адзін у другога скручанаю ў вяроўку вопраткаю. У выніку Левін так моцна выцяў Фішмана ў жывот, што той закрычаў ад болю. Хворы быў зараз-жа накіраваны ў больніцу. Выяўлена, што ад удару ў яго разадралася кішка. Фішману зроблена апэрацыя, але хворы знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы і дактары баяцца за яго жыцьцё.

На агульным сходзе рабочыя камбінату рашуча зганьбілі гэты хуліганскі ўчынак.

Пракуратура праводзіць па справе дазнаньне.

Дамброўскі.

У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ ПАХОДЗЕ.

Харчавікі Гомельшчыны выходзяць на сацыялістычнае спаборніцтва.

Нядаўна ў Гомелі адбыўся трэці акруговы зьезд харчавікоў Гомельшчыны.

Падвёўшы вынік сваёй гадовай працы, зьезд адзначыў, што ў працы акруговага праўленьня саюзу і нізавых ячэек пытаньні вытворчасьці, якасьці прадукцыі, вытворчасьці працы, зьніжэньня сабекошту—не знашлі належнага адбітку.

Новаму складу акруговага праўленьня зьезд даручыў зьвярнуць максымум увагі на гэту працу, уцягнуўшы ў актыўны ўдзел нізавыя ячэйкі і прафактыў.

Дзеля пасьпяховага правядзеньня гэтай працы зьезд ухваліў выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва харчавікоў Гомельшчыны і харчавікоў Беларусі і заключыць між асобнымі прадпрыёмствамі акруг палітычныя ўмовы аб выкананьні пастаноў ураду і дырэктыў партыі аб узьняцьці вытворчасьці працы, палепшаньні якасьці прадукцыі і інш.

Па даручэньні зьезду Гомельскі акруговы камітэт зьвярнуўся да ўсіх харчавікоў Беларусі з заклікам уступіць у сацыялістычнае спаборніцтва на працягу ўсяго 1928-29 гаспадарчага году.

Спаборніцтва будзе праходзіць пад лёзунгам поўнага выкананьня прамысловых і фінансавых плянаў—зьніжэньне сабекошту на 7 проц., падняцьце вытворчасьці на 17 проц.—праз рацыянальнае выкарыстоўваньне рабочай сілы, ушчыльненьне працоўнага дню, зьнішчэньне тэхнічных і іншых прастояў і прагулаў, падняцьце працоўнай дысцыпліны, палепшаньне працы вытворчых нарад.

Харчавік.

Мы--за мільён рублёў прыбытку.

(Менск. Зав. Бальшавік).

На чырвонаштандартным скураным заводзе „Бальшавік" нядаўна адбылася агульна завадзкая канфэрэнцыя рабочых заводу.

Адным з галоўных пытаньняў заводу было пытаньне палепшаньня якасьці прадукцыі і ўзьняцьця вытворчасьці працы.

Гэта пытаньне было завострана таму, што ў П-м квартале якасьць хрому панізілася; у чырвонадубільным цэху процант браку вялікі кульгае працоўная дысцыпліна; ёсьць выпадкі калі рабочыя сьвядома псуюць тавар.

Рабочыя ў сваіх выступленьнях ганьбілі тых, хто нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, парушае працоўную дысцыпліну ці ня хоча выконваць загадаў майстроў, ці проста ня слухае майстра і сварыцца з ім.

Наш лёзунг—мільён рублёў прыбытку,—казалі рабочыя.

Гэтыя грошы нам патрэбны дзеля таго, каб пабудаваць патрэбную для Беларусі абутковую фабрыку ў Віцебску і мастаўёвага заводу ў Гомелі...

— Трэба гэтыя грошы здабыць, але патрэбны самыя ўважлівыя адносіны рабочых да сваіх абавязкаў.

Завод „Бальшавік", узнагароджаны ордэнам Чырвонага сьцягу, дырэктыву партыі і савецкай улады аб зьніжэньні сабекошту і ўзьняцьці вытворчасьці працы выкапае.

Рабочыя дакажуць яшчэ раз адданасьць вялікай справе. Залог гэтаму—актыўнасьць агульна-заводзкай рабочай канфэрэнцыі.

N.

Мы пераможам.

(Ад нашага полацкага карэспандэнта).

30 красавіка адбылося ўрачыстае пасяджэньне полацкага гарсавету.

Старшыня гарсавету, рабочы-чыгуначнік тав. Бадуноў, адчыняе ўрачыстае пасяджэньне. З вялікім дакладам аб значэньні першага мая выступае Наркамфін БССР, прадстаўнік ад ураду на акруговы зьезд саветаў, т. Мікуліч. Ён гаворыць аб гісторыі сьвята, аб тым, як у гэты дзень працоўныя ўсяго сьвету дэманструюць свае рэвалюцыйныя сілы, вступаюць супроць капіталістаў і буржуазеі.

— Сёньня там,—кажа тав. Мікуліч—на Захадзе, на Ўсходзе, працоўныя пройдуць з чырвонымі сьцягамі пад знакам вызваленьня ад эксплёатацыі. Там яшчэ—ланцугі Мы-ж, працоўныя СССР, сьвяткуем гэта вялікае сьвята вольна. Нашымі задачамі ў гэты дзень зьяўляюцца — замацаваць шчыльную інтэрнацыянальную сувязь з працоўнымі ўсяго сьвету, падняць індустрыялізацыю краіны, працоўную дысцыпліну сярод рабочых, наклапаціцца аб уздыме сельскае гаспадаркі і з ленінскай загартаванасьцю ісьці да сацыялізму.

* * *

Вось і 1 мая. Яшчэ зраньня горад прыняў нязвычайны выгляд. Чырвоныя сьцягі калыхаў лёгкі вецярок, а вялізныя плякаты, размалёваныя чырвонымі літарамі, нібы крычалі: Няхай жыве першае мая!

Адчыняецца мітынг. Прывітальныя прамовы скончыліся. Заварушыўся натоўп. Заіграла музыка. Пераліўныя гукі калышуцца ў паветры, разьліваюцца зьнікаюць высока над горадам.

Бадзёра ідуць чырвоныя байцы Ж-скай Чырвонаштандартнай дывізіі. Мерна адбіваюць крок. Твары радасныя. Сіла волі сьвеціцца ў вачох кожнага.

Лёзунгі, прывітаньні, музыка зьліваюцца у адзін гучны акорд, які нібы кажа: мы пераможам.

Сьпір. Міхальцоў.

Аб прыёме ў навучальныя ўстановы БССР.

Калегія НКА БССР зацьвердзіла правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы на 1929—30 навучальны год. Зацьверджаныя правілы прыёму ў значнай ступені розьняцца ад правіл прыёму мінулых гадоў. Асноўны прынцып, які пакладзен у правілы прыёму г,г.—гэта пралетарызацыя ВНУ, недапушчэньне ў навучальныя ўстановы асоб сацыяльна чужога пахаджэньня.

Дзеля таго, каб недапусьціць пралезьці ў навучальныя ўстановы асобам сацыяльна чужым, правілы прыёму прадугледжваюць гэтае зьявішча і патрабуюць ад кожнага паступаючага ў ВНУ прадстаўленьня шэрагу дадатковых дакумантаў, як, напрыклад, аб сацыяльным пахаджэньні, чым бацькі займаліся да вайны і г. д. Асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў, а таксама асобы, якія жывуць на непрацоўны прыбытак, зусім ня будуць прымацца ў ВНУ і тэхнікумы.

Пэдфак у гэтым годзе з першага курсу будзе будавацца на базе пэдтэхнікуму. Гэта значыць, што на I курс пэдфаку будуць прымацца асобы, якія скончылі пэдтэхнікумы, ці роўныя па праграме ўстановы. Настаўнікі, што скончылі настаўніцкія сэмінарыі і жадаюць паступіць на I курс пэдфаку павінны будуць вытрымаць калёквіумы па матэматыцы, грамадазнаўству і мове; настаўнікі, што скончылі настаўніцкія інстытуты, па грамадазнаўству і мове.

Асобы, якія скончылі прафшколы на базе сямігодкі і прайшлі 2-х гадовы практычны стаж, будуць прымацца ва ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы з іспытамі толькі па беларускай мове.

У гэтым годзе пры БДУ адчыняецца хіміка-тэхнічны факультэт. На гэты факультэт, а таксама на гідра-тэхнічнае і тарфянае аддзяленьні мэлфаку с-г Акадэміі будуць прымацца асобы, якія скончылі тэхнікумы, але і яны павінны будуць трымаць іспыты па матэматыцы і беларускай мове.

Каб даць магчымасьць вучыцца ў ВНУ рабочым ад варштату, правілы прыёму прадугледжваюць для іх палёгкі пры паступленьні. Рабочыя ад варштату, якія скончылі вячэрнія школы ўзвышанага тыпу, на сацыяльна гістарычнае і лінгвістычнае аддзяленьні пэдфаку, праўнае аддзяленьне Правгасу, на Мэдфак БДУ, у вэтэрынарны інстытут, на аграфак с-г акадэміі будуць прымацца з іспытамі толькі па беларускай мове. На ўсе іншыя факультэты і аддзяленьні яны павінны будуць вытрымаць дадаткова іспыты і па матэматыцы.

Фэльчары, якія скончылі нармальныя фэльчарскія школы, будуць прымацца на Мэдфак і ў Вэтэрынарны Інстытут з іспытамі па грамадазнаўству, матэматыцы і беларускай мове.

Усе асобы, якія ня маюць належнай асьветы, павінны будуць трымаць іспыты на ўсіх дысцыплінах. Пры прыёме захоўваецца курыяльная сыстэма, гэта значыць—перавага будзе аддавацца рабочым, іх дзецям, дзецям бяднейшых сялян і дзецям спэцыялістаў і настаўнікаў.

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе будзе праведзена райёпаваньне пэдтэхнікумаў. Асобы, якія пражываюць у тэй ці іншай акрузе, павінны будуць паступаць вучыцца ў свой акруговы пэдтэхнікум.

У пэдтэхнікумы прыём будзе праводзіцца бяз іспытаў, калі вучань скончыў 7 годку. У палітэхнікумы, лясны тэхнікум і земляўпарадкаўчы асобы, што скончылі 7-х годкі, павінны трымаць іспыты ма матэматыцы.

Асобы, якія скончылі 2-х гадовыя пэдкурсы, могуць паступіць бяз іспыту на 3 курсе пэдтэхнікуму, калі яны маюць 2-х гадовы практычны стаж.

М.

ХРОНІКА.

Пэрсанальная пэнсія сям'і забітага т. Варавы.

Згодна пастановы АВК сям'і забітага т. Варавы вызначана пажыцьцёвая пэнсія 120 руб. у месяц.

* * *

Сьледчымі органамі вядзецца высьвятленьне справы Варавы. Аб выніках сьледзтва будзе паведамлена ў газэце.

Сёньня адчыняецца ўсебеларускі зьезд хірургаў.

Сёньня, у серраду, 8 мая, у памяшканьні клюбу „Мэдработнік" адчыняецца 1-шы ўсебеларускі зьезд хірургаў, гінэколёгаў і акушэраў. На зьезд чакаюць прыбыцьця каля 200 дактароў. Зьезд заслухае звыш 40 навуковых дакладаў і паведамленьняў і працягнецца 4 дні.

Падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату.

Па ўсіх групах працаўнікоў саюзу савгандлькслужачых ужо праведзены агульныя сходы. Пазаўчора адбыўся агульны сход працаўнікоў, міліцыі, спрэўдому і крымвышуку.

На сходах абраны прадстаўнікі для ўдзелу ў рабочых камісіях па чыстцы савецкага апарату. Па ўсіх мясцкомах насьценныя газэты прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да чысткі.

Аб водпусках рабочым і служачым.

Нашаму супрацоўніку паведамілі, што з 1 мая ўводзіцца новае палажэньне аб працягу водпускаў, па якому для дарослых рабочых і служачых, апрача занятых на шкодных і небясьпечных прафэсіях, працяг водпуску складае 12 рабочых дзён, а для апошніх—24 рабочыя дні.

Для падростка, якія ня маюць 18 год, водпуск устаноўлен у адзін каляндарны месяц.

Штотыднёвыя сьвяточныя і асобныя дні адпачынку ў рахунак водпуску не залічваюцца.

Вытворчыя экскурсіі рабочых.

ЦП саюзу друкароў наладжвае вытворчыя экскурсіі рабочых у Маскву і Ленінград для азнаямленьня з пастаноўкай у гэтых гарадох паліграфічнай вытворчасьці.

15 мая выяжджае з Менску першая вытворчая экскурсія рабочых у складзе 25 чалавек.

Апрача вытворчых экскурсій ЦП саюзу наладжвае шэраг звычайных экскурсій па СССР.

Пачалася сяўба.

ПЕРШЫЯ БАРОЗНЫ.

Водпуск вестак Наркамзему, у паўднёвай частцы БССР пачалася сяўба. Ужо сеюць ячмень, пшаніцу і садзяць бульбу.

СТАН АЗІМІНЫ І КАНЮШЫНЫ ЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ.

Сёлета азіміна вышла з-пад сьнегу ў здавальняючым стане. Стан канюшыны таксама здавальняючы.

ПАДРЫХТОЎКА ЗЯМЛІ ПАД ЛУБІН.

У савгасе „Негарэлае" працуюць 2 трактары, якія сёлета вясной павінны падняць 150 гэкт. аблогаў, дзе будзе арганізаваны насенны фонд лубіну. Усяго ў гэтым савгасе будзе ўзьнята пад лубін 400 гэкт. зямлі.

ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЕ ПРАХОДЗІЦЬ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Па напоўных вестках, да 1 мая ачыстка збожжа ў акругах дала наступныя выніні. Менская акруга выканала заданьне больш як на 100 проц., Магілёўская—на 93,5 пр., Аршанская—на 91 проц., Віцебская—на 94,7 проц., Гомельская—на 85 проц., Полацкая—на 44 проц.

Усебеларуская нарада па пэдагагічнай асьвеце.

Наркамасьветы пастанавіў склікаць 11 чэрвеня ўсебеларускую нараду па пэдагагічнай асьвеце. У нараде прымуць удзел прадстаўнікі ўсіх пэдтэхнікумаў, 2-гадовых пэдагагічных курсаў і пэдфаку БДУ.

Нарада абгаворыць 5-хгадовы плян падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў і ўкамплектаваньне студэнтамі на будучы год, дапісаньне праграм пэдагагічных навучальных устаноў да арганізацыі школ і насельніцтва і шэраг іншых пытаньняў. Нарада працягнецца 5 дзён. Удзельнікам нарады НКА будзе прадстаўлен інтэрнат, а прадстаўнікам студэнцкіх арганізацый і харчаваньне.

Рыхтуюцца да летняга сэзону.

Культаддзел саюзу савгандлькслужачых вядзе падрыхтоўчую працу да арганізацыі летніх дзіцячых пляцовак. Усяго па гораду мяркуецца арганізаваць на сродкі культфонду і калектываў 5 дзіцячых пляцовак, якімі будзе ахоплена звыш 150 дзяцей членаў саюзу

Дзіцячая пляцоўка друкароў.

ЦП саюзу друкароў за рахунак сродкаў фонду палепшаньня быту адчыняе ў сваім саюзным садзе летнюю дзіцячую пляцоўку на 30 дзяцей. Адчыненьне пляцоўкі адбудзецца 1 чэрвеня.

Забойства на рамантычнай глебе.

6-га мая а 10-й гадзіне ўвечары ў садзе „Прафінтэрн" на рамантычнай глебе адбылося падвойнае забойства: рабочы менскай абойнай фабрыкі Янка Насеньнік выстраліў у работніцу тэй-жа фабрыкі Асю Фрыд. Пасьля гэтага Насеньнік сам застрэліўся. 7-га мая Насеньнік памёр, Фрыд-жа ў цяжкім становішчы знаходзіцца ў больніцы.

Жакты і дыфэрэнцыяваны пай.

Нашы жакты заўсёды адчуваюць патрэбу ў сродках. Нават такі буйны жакт, як жакт № 2, які мае дзесяткі дамоў на галоўных вуліцах—Ленінскай і Савецкай,—і той таксама адчувае гэтую патрэбу. У сакавіку 1928 г. яго завінавачанасьць дасягнула буйнай лічбы —40000 р., і зараз ён яшчэ ня зусім заплаціў сваю завінавачанасьць.

Гэтыя фінансавыя цяжкасьці вельмі адбіваюцца на дабрабыце жактаўскіх кватэр. Няма грошай, значыцца, няма рамонтаў—часамі самых неабходных і невялікіх.

Пасьля вышэйсказанага няма нічога дзіўнага, што на адбыўшымся ў Менску ў сакавіку г. г. зьезьдзе ўпаўнаважаных жактаў ухвалена пастанова павялічыць пай для членаў жактаўскіх дамоў з 10 р. да 15 р., інакш будуць выключаны з ліку пайшчыкаў.

Гэтую пастанову можна толькі вітаць. Калі наша жыльлёвая каапэрацыя адчувае вялікую патрэбу ў грошах, няхай жактаўцы-рабочыя, служачыя і саматужнікі—дапамогуць ёй сваімі павялічанымі паявымі ўзносамі.

Але, чаму-б нашым жактам не пайсьці па прыкладу нашай спажывецкай каапэрацыі (МЦРК) і ня ўвесьці для сваіх членаў дыфэрэнцыяваны пай: 15 руб.—гэта мінімум, які павінен выканаць кожны радавы член жакту, а максымум ад 20 да 50 р. павінен заплаціць рабочы і служачы, які атрымлівае больш буйную стаўку — больш 100 р. у месяц. Няхай Белжылсаюз больш падрабязна распрацуе нормы дыфэрэнцыяванага паю для жактаў.

Да гэтай-жа мэты—павялічэньня фінансавых сродкаў нашых жактаў—імкнецца таксама пастанова ЦВК БССР ад 23 лютага 1929 г. аб аплаце жыльлёвых памяшканьняў у гарадох БССР.

С. Эвенчык.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Выдавецтва. На яўрэйскай мове.

1. „ВАВЁРКА" Ботвін. (п'еса) Стар 80, цана 80 кап.
2. „СПАРТАК" Д. Гофштэйн, (п'еса) Стар. 48, цана 35 к.
3. „НА ТЫМ БАКУ ШЧЫЛІНЫ", (п'еса). Стар. 72, цана 95 к.
4. „СШЫТАК МАТЭМАТЫЧНЫХ ПРАЦ" С. Сагаловіч. Стар. 52, цана 20 к.

Да арганізацыі аддзелу быту на 1-ай усебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы.

У 1930 г. у Менску адчыняецца 1-я усебеларуская с.-г. выстаўка, якая павінна паказаць дасягненьні БССР у галіне сельскай гаспадаркі

На гэтай выстаўцы будзе выяўлен і паказан быт і рэчы хатняй працы сялянства БССР. Гэта—першая ў Беларусі выстаўка, дзе будзе паказаны сучасны бытавы ўклад шырокіх колаў сялянскіх мас у розных клясавых праслойках.

Сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, які адраджае гаспадарку на сацыялістычнай перабудове, на працягу ўжо больш дзесяці год робіць значныя зьмены ў бытавым гаспадарчым укладзе сялянства БССР Тая праца, якая зараз праводзіцца ў вёсцы камуністычнай партыяй і савецкай грамадзкасьцю над культурным узьняцьцем мас, над перабудовай бытавых умоў у рабочых і сялянскіх масах, з свайго боку, прысьпяшаюць працэс развальваньня старога быту і ўтварэньня новага, адпаведнага сацыялістычнаму ладу жыцьця.

Пад націскам сацыяльна-эканамічных фактараў і культурных уплываў гораду новы быт прабіваецца ва ўсе галіны бытаваньня вясковага селяніна. Уся наша рэчаістасьць сьведчыць аб паступовым рашучым узмацненьні ў быту новых зьявішчаў і адміраньня старога ўкладу жыцьця, старых бытавых традыцый.

Але мерапрыёмствы, якія зараз праводзіць урад БССР у галіне сельскай гаспадаркі, неаднолькова адбіваюцца па дабрабыце розных пластоў сялянства. Бытавы ўклад селяніна-бедняка, серадняка і заможніка за гады рэвалюцыі вывіў розныя эвалюцыйныя зьмены і плыні. Узьдзейнічаньне сацыялістычных фактараў на бытавую абстаноўку за гэтыя гады ў сялянскіх масах выявілася са ўсёй рэзкасьцю і паказала на ўтрыманьне старога быту ў заможных пластох сялянства і пераход да новага быту селяніна-бедняка.

Шкода, што нашых этнографаў зусім ня цікавіць гэта надзвычайнае зьявішча—момант пералому бытавога ўкладу, бытавых традыцый нашага сялянства. Толькі запісы мясцовых краязнаўцаў ды сельскія карэспандэнты, на вачох якіх паглыбляецца шчыліна паміж старым і новым бытам, знаёмяць нас з барацьбой старога і новага быту і рысуюць малюнак гэтай барацьбы на вёсцы.

Па сваёй канструкцыйнай пабудове аддзел быту на выстаўцы не павінен уяўляць сабой нешта асобнае ад усёй сельска-гаспадарчай выстаўкі. Ён цалкам павінен быць зросшымся з усёй выстаўкай і характарызаваць адзін з момантаў працоўнай дзейнасьці сялянскіх мас у рэвалюцыйны час з паказаньнем працэсаў паступовага разьвіцьця форм быту і гаспадарчага ўкладу ў гістарычным разрэзе.

Цэнтральным месцам на выстаўцы павінен быць сучасны быт, які вынікае з палітыкі савецкай улады ў БССР у галіне эканомікі і культуры. Быт народу зьяўляецца толькі часткаю сацыяльна-эканамічнага ўкладу і адпавядае тым ці іншым гаспадарчым формам. З пераменаю гаспадарчых форм мяняецца і бытавы ўклад. Таму на выстаўцы наглядач павінен ўбачыць быт, у яго сучасным праламленьні, у паасобных клясавых праслойках сялянства—бедняка, серадняка і заможніка. Тут павінен быць паказаны быт, які параджаецца ў умовах калектыўнага гаспадараньня, быт рабочых савецкіх гаспадарак; уплыў пралетарыяту на быт селяніна (сувязь гораду з вёскай), сельскія культ.-бытавыя ўстановы і інш.

Паказаныя рэчы быту павінны адбіваць мясцовыя ўмовы і асаблівасьці розных між сабой райёнаў БССР у іх прыродным і эканамічным палажэньні. Са ўсёй дакладнасьцю павінен быць выяўлен і паказан быт сялян розных нацыянальнасьцяў, як: літоўцаў-калёністаў, яўрэяў-земляробаў і інш.

Выходзячы з такіх агульных палажэньняў для выстаўкі быту і рэчаў хатняй працы, галоўная ўвага павінна быць зьвернута на матар'яльны быт селяніна. У аддзеле быту не павінна быць музэйных рэдкасьцяў, якія дзе-ні-дзе яшчэ захаваліся над паведцямі сялян.

Да адчыненьня выстаўкі часу застаецца ня так шмат. Цара распачаць ужо працу па наладжваньні—збору экспанатаў. Неабходна працу ў гэтым напрамку ўвязаць з нашымі навукова-дасьледчымі ўстановамі. Трэба, каб этнаграфічныя экспэдыцыі Бел. Акад. Навук улічвалі патрэбы выстаўкі. Гэта справа павінна зацікавіць Цэнтральнае Бюро Краязнаўства і шырокія колы краязнаўцаў на мясцох. Вясковыя камсамольцы, сялянская моладзь, праз свае партыйныя, грамадзкія і савецкія арганізацыі павінны прыняць удзел у працы па выстаўцы быту.

Толькі дружнай калектыўнай працай, разумеючы агромністае значэньне ілюстрацыі на выстаўцы бытавога ўкладу сялянскіх мас БССР, можна перамагчы ўсе цяжкасьці, якія сустрэнуцца ў гэтай новай справе і даць поўны малюнак быту вёскі сучаснай Савецкай Беларусі.

Уся праца павінна праходзіць пад лёзунгам: на выстаўку быт сучаснай вёскі ў яе клясавым расслаеньні, з ілюстрацыяй эвалюцыі бытавых форм!

М. Мялешка.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

СЕРАДА, 8 МАЯ.

ДЛЯ ЛКСМ — „КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ"

Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». — ХУТКА! ХУТКА! „400 МІЛЬЁНАЎ"

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — З ПАНЯДЗЕЛКА, 6 МАЯ. Мастацка-гістарычны фільм з жыцьця паэты М. Ламаносава. СЫН РЫБАКА. Кіно-аповесьць у 7 част.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — 2-ГІ ТЫДЗЕНЬ „МЯЦЕЖ" паводле аповесьці Д. Фурманава ПАЧАТАК а 6 г. 30 хв.

1-ЫДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». — „СТЭНЛЕЙ У НЕТРАХ АФРЫКІ" З СЭРЫЯ Ў 7 ЧАСТКАХ.

Аршанскі ЗАГС паведамляе, што камандзір узводу сапёрнай роты 64 стр. Дывізіі Прэсман Сруль Барысаў мяшкаючы у г. Воршы мяняе свае імя Сруль на Аляксандр. Зацікаўленыя асобы павінны падаць свае прэтэнзіі ў Аршанскі ЗАГС не пазьней 2-х тыдняў з моманту публікацыі гэтае аб'явы.

Троцкі с-савет Уваравіцк. р-ну Гомельск. акр. паведамляе, што на 28 мая 1929 г. назначана справа аб скасаваньні шлюбу Будзенкавай Тацяны Парф. з гр-нам Будзенкавым Адамам Евдок., месца жыхарства якога невядома. У выпадку неяўкі Будзенкава А. Е., справа будзе слухацца завочна.

Ад аб'яднанага Бюро Скаргаў Менскага АКК РСІ і ЦКК НКРСІ Беларусі

Згодна пастановы красавіковага пленуму ЦКК КП(б)Б Бюро Скаргаў Менскай Акруговай Кантрольнай Камісіі і РСІ аб'яднана з Цэнтральным Бюро Скаргаў ЦКК НК РСІ.

Бюро Скаргаў Менскай АКК РСІ па вул. Энгельса № 28 спыніла прыём скаргаў з 6 мая г. г. і гэткія прымае Аб'яднанае Бюро Скаргаў па Савецкай вул. № 55 (ніжні паверх—налева).

Наведвальнікі прымаюцца штодзённа: у буднія дні ад 9 да 3 гадз.; дзяжурны член ЦКК НК РСІ прымае ў буднія дні ад 6 да 9 гадз. увечары, а ў нядзелю гадз. дню (2-гі паверх, пакой № 2).

Напамінаючы аб тым, што пасылаюцца па пошце на адрас Бюро Скаргаў АПЛАЦЕ І ГАЮЦЬ І ПЕРАСЫЛАЮЦЦА БЯСПЛАТНА, просім гэткія Аб'яднанаму Бюро Скаргаў—Менск, № 55, Менск.

БЮРО СКАРГАЎ НК РСІ МЕНСК. АКК РСІ

СУД.

ЛАТЫГАЎСКІ ГНОЙНІК.

Два гады таму назад, у часе звароту з пленуму Халопеніцкага РВК, старшыня Латыгаўскага сельсавету Алесь Харкоўскі і сэкратар Нікандр Наталевіч спаткалі на шляху аб'ездчыка Краснаслуцкага лясьніцтва Панаса Ліцьвіна.

—А, здароў, Ліцьвін! — крыкнуў Харкоўскі.

— Здароў, здароў, Алеська як жывеш, і куды гэта едзеце ў такі мароз?—спытаўся Ліцьвін.

— Дамоў з пленуму РВК, але надта зьмерзлі з сэкратаром.

— У чым жа справа? можна—хутка пагрэцца: вось вёска, хіба вясковаму начальству пашкадуюць самагонкі?

— Пагрэцца як пагрэцца, а шклянчака з марозу не пашкодзе.

Першае знаёмства Харкоўскага і Наталевіча з „карысным" чалавекам Ліцьвіном адбылося, па чутках, у хаце вядомага самагоншчыка Рабцэвіча, дзе начальства замацавала сваё знаёмства некалькімі бутэлькамі самагону.

Пасьля першага знаёмства сябры паабяцалі бываць адзін у аднаго ў гасьцёх.

З мэтай заўсёды дастаць самагонкі і месца для гульні Харкоўскі, Наталевіч і Ліцьвін хутка пазнаёміліся з кулаком Іванам Навіцкім, у якога дом на 5 пакояў і дзякам Латыгаўскай царквы Умейскім, вялікім шутнікам і „спэцам" выпіць і расказваць анэкдоты.

Пашло п'янства. Сельсавет тыднямі не адчыняўся наведвальнікі, прыходзілі за даведкамі, але начальства гуляла, і турбаваць іх ніхто не асьмельваўся.

Калі хто заходзіў да Навіцкага ці Козыра, дзе звычайна адбываліся выпіўкі з удзелам дзяка Умеўскага, ён выходзіў з каморкі і адказваў наведальніку:

— Толькі рыпні—мала табе ня будзе!

Гэта рабілася на вачох сялян, усе маўчалі, і бясчынства вясковага начальства" адбываліся далей.

Прыехаўшы аднойчы ў вёску ва па справах, Харкоўскі, Н... Ліцьвін застаналіся ў грама... Курган, дзе наладзілі п'янку з некалькіх жанчын, а пасьля ... коўскі там заначаваў, прычы... ваўся згвалціць гр-ку Курган.

Па прыкладу старшыні сельс... коўскага аб'ездчык Ліцьвін, к... зварачаліся жанчыны за лесам... шаў іх спачатку аддацца яму, ... абяцаў даць лесу. Аднойчы сял... паніда Гаспадарык зьвярнулася ... коўскага з просьбай даць хара... ку аб яе мужу, які быў ар... Харкоўскі запрапанаваў Гаспад... чатку паставіць выпіўку і адд... прычым абяцаў ня толькі даць ... рыстыку, а і пахадайнічаць а... леньні яе мужа з-пад варты.

Сродкі на п'янства старшыня ... скі і сэкратар Наталевіч дабыва... ным чынам: складалі сялянам ф... акты на нібы прапаўшую жывёл... актах ашуканскім спосабам с... рымлівалі страхоўку, прычым ... страхавой прэмі давалі „начальс... мён Наталевіч, напрыклад, атр... такому акту 20 р. страхоўкі, з ... даў Харкоўскаму.

Выязная сэсія Менскага а... суду ў м. Халопенічах прыгава... наса Ліцьвіна—на тры гады зь... ня, Алеся Харкоўскага і Нікан... левіча—на два з паловай гады С... Наталевіча—на шэсьць месяцаў ... сты мера сацыяльнай абароны ... тром скарочана напалову, а Сяр... левіч з-пад варты вызвален.

ШАХМАТЫ № 15 (160)

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Задача № 15 Я. Каменецкага. Менск.



Бел. Крh8, Фb2, Лb5, Сf7, Сh2, Кg8, Кh1, п. п. e2, g2, h7, (10).

Чорн. Крg4, Фа7, Лс8, Лd3, Сb6, Кс3, п. п. b7, b3, d6, e5, h3 (11).

МАТ У 2 ХАДЫ.

Менскія міжпрафсаюзныя і на-шашачныя спаборніцтвы.

На пасяджэньні шахматна-ш... актыву пры культаддзеле ЦСП ... пастаноўлена ўрачыстае адчынен... борніцтваў назначыць 11 мая ... Ігра пачнецца а 12 гадзіне 12 м... ад саюзаў прымаюцца ў культа... 10 мая. Па шахматах вылучаюц... ды па 5 ігракоў і 2 кандыдаты, ... хах—на 7 ігракоў і 2 кандыдаты.

БАРЫСАЎСКІЯ ШАШЫС... МЕНСКУ.

На сьвята 1 і 2 мая каманда ... стаў у складзе т. т. Левіна, Ш... Левітана, Кагана і Хацяновіча ... ў Менск дзеля таварыскіх мат... мандамі прафсаюзаў Менску. ... ская каманда была складзена з ... ігракоў ад прафсаюзаў. Бары... посьпехам згулялі з Менскімі ... першы матч з гарбарамі скончы... шучай перамогай Барысава+8— ... нікі згулялі лепей, але, ня гле... тое, што на першай дошцы гр... стар Гардон, вынік матчу+5—5 ... лістымі матч скончыўся на кары... рысава+6—4 і толькі матч з Са... служачымі Барысаўцы праіграл 6-...

Адказы карэспандэнтам.

Беспрацоўнаму.—На допіс „Скуль бярэцца беспрацоўе" Жлобінскі РВК паведаміў, што Ваша думка аб недазволеньні працаваць мужу і жонцы, асабліва настаўніцтву, немагчыма ажыцьцёвіць. Настаўніцтва напаўняецца ў першую чаргу з ліку беспрацоўных настаўнікаў—сяброў саюзу.

Селькору Х. „Неабходна чыстка" пераслана ў Аршанскую РСІ для расьсьледваньня аб судзьбаканаўцы. Астатнія факты няпоўныя і застануцца бяз вынікаў. У далейшым пішэце больш ясна.

П. Я. „Паскуда" ня пойдзе. Замест паэзіі пішэце аб фактах і пакажэце, дзе яны адбываюцца.

Ведаючаму, Мішуру, Падарожнаг... самольцу, Селькору, Шышку. „Ц... трава" накіравана Хоцімскаму РК ... „Нужна чистка"—Бабруйскаму ... куроору, „Нос па ветру"—Самах... каму РВК, „Трэба вычысьціць"—С... Ціткавіцкага спажывецкага т-ва, ... ходна чыстка" і „Памажэце"—Ар... РСІ.

Варожыну. На Ваш допіс „Кр... Лес" Зеленкавіцкае лясьніцтв... ведамляе, што лес у крэдыт быў ... шчаны Н. Варожына, прычым па... запісан праданы нумар, але поты... нумар выкрэсьлен і сума паменш... 3 р. 45 к.

Апавяшчэньні.

ДА ВЕДАМА СЯЛЯН-ХАДАКОЎ.

— Цэнтральны Дом Селяніна спыніў сваю працу па абслугоўваньню сялян-хаданоў начлегам з 7 па 15 мая г. г. у зьвязку з тым, што інтэрнат ЦД Селяніна заняты дэлегатамі IX Усебеларускага Зьезду Саветаў.

У гэты час будзе праводзіцца ў Цэнтральным Доме Селяніна толькі юрыдычная і аграномічная кансультацыі.

— Сёньня а 6 з пал. гадз. ... памяшканьні НКРСІ окліканцца ... гады па праверцы савецкага апар... прымацаваны да цэнтральных уст...

Яўка ўсіх выбраных у брыгады ... кова, так як данае пасяджэньне ... і паоьля яго брыгады павінны пры... да практычнай работы.

Н...

Адказны рэдактар М. КУДЗЕ...

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 29

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

гор. Менск. 4-га мая 1929 г.

Аб ахове садоў, сквэраў і зялёных насаджэньняў.

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Забараніць на бульварах, сквэрах і ў садох агульнага ка... станьня:

а) хадзіць, сядзець і ляжаць на траве;

б) ламаць дрэвы і кусты, рваць галіны і кветкі, касіць і ... траву;

в) насьмечваць і кідаць паперу, акуркі, пачкі з-над папяр... шалупіньне і інш. сьмяцьцё;

г) ламаць садовыя лаўкі, градкі, плоты і інш. пабудовы ў сад...

д) праводзіць гульні і займацца спортам, за выключэньнем ... спэцыяльна адведзеных;

е) езьдзіць па дарожках на велёсыпэдах і коньна;

ж) пасьвіць коз, кароў і інш. хатнюю жывёлу, як на бульвар... сквэрах, у садох, так і на вуліцах і прывязваць да дрэў і агарод...

2. Забараніць прывязваць коняй на час стаянкі да дэкаратыўн... дрэваў, якія растуць на вуліцах, пляцох і рынках і да іх агарод...

3. Вінаватыя ў парушэньні гэтае абавязковае пастановы прыц... вацца да адміністрацыйнай адказнасьці: штрафу да 1 рубля, які п... цяць на месцы ўчынку вартаўніку, альбо міліцыі, з атрыманьн... квітка ў выплаце.

На асоб, якія адмовяцца ад уплаты штрафу, складаецца пратак... па якому накладаецца штраф да 3-х рублёў аль